“太阳，到这里来……”

“ DEAR SUN,
PLEASE, COME TO US...”

« ХАДЗІ, СОНЕЙКА,
ДА НАС... »

白俄罗斯国家科学院
白俄罗斯文化、语言和文学研究中心
孔德拉特·克拉披瓦艺术学、民族学和民间创作的研究所
白俄罗斯国立艺术学院

“太阳，到这里来……”

（来源于民间文化遗产）

明斯克
“白俄罗斯科学出版社”
2019

NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

CENTRE FOR BELARUSIAN CULTURE, LANGUAGE AND LITERATURE

Institute of Art Studies, Ethnography and Folklore Research Kandrat Krapiva

BELARUSIAN STATE ACADEMY OF ARTS

"DEAR SUN, PLEASE, COME TO US..."

(folk heritage collection)

Minsk

"Belaruskaya navuka"

2019

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ

«ХАДЗІ, СОНЕЙКА, ДА НАС...»

(з народнапаэтычнай спадчыны)

Мінск

«Беларуская навука»

2019

УДК 398.6(=161.3)
ББК 82.3(4Беи)
Х14

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Аўтары ідэі, укладальнікі:
А. І. Лакотка, Т. І. Кухаронак, А. Г. Алфёрава

Пад агульнай рэдакцыяй
акадэміка А. І. Лакоткі

Мастакі:
В. А. Багнюк, К. А. Вішнеўская, К. У. Гормаш, В. П. Гормаш-Дрэбезава, Х. С. Іванцова, А. А. Кісляк, Ю. У. Мацура, Д. Ю. Петрусевіч-Кавальчук, Г. І. Сідарэнка, А. А. Стальмашонак

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар В. С. Новак,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар В. І. Жук

«**Хадзі**, сонейка, да нас…» = "太阳，到这里来……" = "Dear sun, please, come to us…" : (з народнапаэтычнай спадчыны) / аўт. ідэі, уклад.: А. І. Лакотка, Т. І. Кухаронак, А. Г. Алфёрава ; пад агул. рэд. А. І. Лакоткі ; пер. на кіт. Ван Цінфэна, А. В. Раманоўскай ; пер. на англ. мову А. В. Раманоўскай, Ю. М. Шукала, Л. Болтана-Сміта ; маст.: В. А. Багнюк [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2019. — 183 с. : іл.

Х14

ISBN 978-985-08-2465-3.

У прапанаваную кнігу ўключаны калыханкі, забаўлянкі, песні, заклічкі, лічылкі, якія адрасаваны дзецям або бытуюць у дзіцячым асяродку. Даецца пераклад тэкстаў на кітайскую і англійскую мовы. Выданне багата ілюстравана арыгінальнымі малюнкамі жывапісу і графікі, выкананымі мастакамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца культурай народаў свету.

УДК 398.6(=161.3)
ББК 82.3(4Беи)

ISBN 978-985-08-2465-3

© Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, 2019
© Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2019

УВОДЗІНЫ

араджэнне і выхаванне дзяцей былі для беларускага народа натуральным і галоўным прызначэннем сям'і. У народнай культуры дзеці спрадвечна лічыліся Божым дарам, дабраславеннем сям'і, былі ўвасабленнем шчасця, з імі звязваліся надзеі на бессмяротнасць — прадаўжэнне роду. Дзеці — гэта дагледжаная старасць, апрацаваная зямля, вясёлы смех унукаў у дзедаўскай хаце.

Традыцыйнае земляробчае грамадства на працягу многіх стагоддзяў выпрацавала аптымальную сістэму выхавання і навучання дзяцей, падлеткаў, моладзі — народную педагогіку. Адным з дзейсных сродкаў выхавання быў дзіцячы фальклор. Апрабаваная і ўзаконеная многімі пакаленнямі народная педагогіка павінна была забяспечыць перадачу жыццёва неабходных працоўных навыкаў, ведаў аб прыродзе, чалавеку, навакольным свеце. У народнай педагогіцы беларусаў перыяд дзяцінства і сталення падзяляўся на пяць узроставых ступеняў: 1) *ранняе маленства* — ад нараджэння да 2–3 гадоў, што пазней у афіцыйнай педагогіцы атрымала назву «школа пеставання», або «мацярынская школа»; 2) *маленства* – ад 2–3 да 6–8 гадоў, у афіцыйнай педагогіцы — «гульнёва-імітацыйны перыяд»; 3) *дзяцінства, або пастухоўскі перыяд,* — ад 6–8 да 12–14 гадоў, у афіцыйнай педагогіцы – «перыяд падсобных работ»; 4) *падлеткавы* — ад 12–14 да 16–17 гадоў, «перыяд спецыялізаванай працы, рознабаковай падрыхтоўкі да жыцця»; 5) *юнацтва* — ад 16–17 да 18–21 года, «чалавек, гатовы да жыцця, прадукцыйнай працоўнай дзейнасці, стварэння сям'і». Нашы продкі добра разумелі працэсы фізічнага, псіхалагічнага, эмацыянальнага, разумовага развіцця дзіцяці, асаблівасці кожнага з этапаў яго сталення. Пазней эмпірычныя народныя веды беларусаў былі пацверджаны афіцыйнай педагагічнай навукай. Так, ва ўяўленнях нашых продкаў адказным перыядам у развіцці дзіцяці лічылася ранняе маленства. Найбольш запатрабаванымі ў гэты час былі калыханкі і забаўлянкі, якія пазней даследчыкі-народазнаўцы назавуць «мацярынскім фальклорам», або фальклорам дарослых для дзяцей.

У традыцыйнай беларускай сям'і з першых дзён з'яўлення дзіцяці маці ці бабуля спявалі для яго калыханкі. Калыханка прызначалася не толькі для таго, каб заспакоіць дзіця і мякка ўвесці яго ў сон, яна была зыходнай формай далучэння дзіцяці да свету блізкіх людзей. Дзеці слухалі калыханкі, засвойвалі першапачатковы слоўнікавы запас, без якога немагчыма пазнанне навакольнага свету, развіццё мыслення. Калыханкі з'яўляліся той школай, праз якую дзіця спасцігала родную мову, яе паэтычныя і музычныя асаблівасці. Нашы продкі хацелі, каб дзеці адчувалі сябе ў атмасферы прыязнасці і пяшчоты, таму пераважная большасць беларускіх народных калыханак вызначаецца мяккасцю гучання, яны светлыя і ласкавыя. «Слухаючы такую песню, — пісаў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, — гэтую адвечную і неўміручую песню матчынай любові, міжволі думаеш: можа быць, менавіта адсюль, вось з такой калыханкі, з яе самай простай і самай геніяльнай на зямлі мелодыі і пачынаецца чалавек»[1]. Выяўлена, што на першым месяцы жыцця мелодыя калыханкі, яе асаблівы гарманічны гукавы лад супакойваюць немаўля і назаўсёды застаюцца ў падсвядомасці як увасабленне гармоніі, спакою, шчасця. Менавіта яна (ужо неўсвядомленая) часта ўтрымлівае чалавека ад адчаю ў цяжкіх абставінах, ахоўвае яго жыццё.

Энцыклапедычнае вызначэнне калыханкі наступнае — гэта «пераважна кароткія песенькі з ярка выражанай утылітарна-практычнай функцыяй — супакоіць дзіця, закалыхаць, угаварыць спаць, якія спявае маці ці нянька»[2]. Паўсядзённая патрэба ў калыханках прадвызначыла іх жыццёвасць, абумовіла і форму песні, перш за ўсё мелодыю і рытм, а таксама даступнасць зместу, прастату кампазіцыі, займальнасць. Калыханкі старажытныя па сваім паходжанні, пра што сведчаць замоўная форма некаторых з іх, міфічныя вобразы «варкоты», «дрымоты», якія ў іх сустракаюцца, прыпеў — «баю, бай, баюшкі» (ад старажытнарускага дзеяслова «баяць») і інш. У калыханках «варкота», «сон-дрымота» ўзгадваліся як адухоўленыя істоты, што маглі самі прыйсці да дзіцяці па просьбе нянькі, іх мог прывесці, прынесці ў кошыку кот і інш.

---

1 Гілевіч, Н. С. Наша родная песня / Н. С. Гілевіч. — Мінск : Нар. асвета, 1968. — С. 173.

2 Барташэвіч, Г. А. Калыханкі / Г. А. Барташэвіч // Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2005. — Т. 1 : Акапэла — Куцця. — С. 620–621.

Калыханкі знаёмілі дзіця з навакольным светам, расказвалі пра хатніх жывёл, птушак, розных звяроў, іх прыгоды і ўчынкі. Сустракаліся адны і тыя ж апаэтызаваныя персанажы, прадметы, з'явы прыроды. Самымі распаўсюджанымі вобразамі беларускіх калыханак з'яўляюцца кот, куры, галубы. Галоўны персанаж пераважнай большасці твораў — кот, адсюль «спяваць калыханку = спяваць ката». Існаваў нават звычай: перш чым пакласці ўпершыню немаўля ў калыску, класці туды ката, каб дзіцяці добра спалася. Кот быў амаль у кожнай сялянскай хаце. Гэта першая жывая істота, з якой знаёмілася дзіця. У калыханках кот — жаданы госць у хаце, ён памочнік жанчыны, яго клікалі закалыхаць, дапамагчы прыспаць малое. Падкрэсліваліся клапатлівыя адносіны ката да дзіцяці, якія праяўляліся не толькі ў закліканні сну для яго, але і ў выкананні розных іншых паслуг: кот бегаў на таржок «купіць Мані піражок» або на вулку «купіць Мані булку». У беларускіх калыханках кот удзельнічаў у хатняй рабоце, дапамагаў гаспадарам і прасці, і ткаць, і малаціць. Вельмі тактоўна, ненавязліва праз учынкі ката дзецям прывіваліся прасцейшыя навыкі паводзін.

Любімымі персанажамі ў калыханках былі птушкі — куры, галубы, або «гулі-вулі», яны выконвалі ролю апекуноў і даглядчыкаў дзіцяці. Прылятаючы, птушкі прыносілі розныя падарункі для дзяцей: ад «каня варанога» да «шчаслівай гадзінкі». Героямі калыханак з'яўляліся таксама бычок, заінька, волікі, шэранькі ваўчок, вобраз якога служыў для перасцярогі/запалохвання непаслухмянага дзіцяці. Аднак ні ў адной з беларускіх калыханак не знойдзецца ўзгадка пра якуюсьці пачварную істоту, што сапраўды магла б моцна напалохаць немаўля і тым самым пашкодзіць яго здароўю. Як і ў казках, у калыханках жывёлы і рэчы персаніфікаванья, дзейнічаюць і размаўляюць, як людзі, уступаюць у розныя ўзаемаадносіны.

Форма і мастацкія асаблівасці калыханак абумоўлены іх прызначэннем — супакойваць дзіця манатонным напевам, размераным рытмам, які перадаваў пагойданне калыскі. Часам сюжэт у іх толькі намячаўся, не было поўнага яго раскрыцця і завяршэння. Як і ў іншых творах для дзяцей, у калыханках выразна адчувалася апавядальнасць. Многія з іх неслі канкрэтную інфармацыю, неабходную і цікавую для дзіцяці. Адной з характэрных рыс калыханак з'яўляецца тонкая іронія, гумар. У дадзеных творах дзіцячага фальклору

часта сустракаецца парная рыфма. Надзвычайная напеўнасць, пяшчотнасць ствараюцца паўтарэннем асобных слоў, гукаў, ужываннем форм з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі. Не апошняе месца ў калыханках належыць і гукаперайманню[3].

У перыяд ранняга маленства — час павышанай рухавасці дзіцяці неабходна было стымуляваць яго псіхафізічнае развіццё. З гэтай мэтай нашы продкі ўжывалі разнастайныя забаўлянкі, якія спалучаліся з фізічнымі практыкаваннямі і своеасаблівым масажам. Па сваім прызначэнні забаўлянкі супрацьпастаўляліся калыханкам. Яны павінны былі весяліць, пацяшаць дзіця, узбуджаць яго, рабіць бадзёрым. Таму і форма забаўлянак адрозніваецца ад напеўных манатонных калыханак. Гэта не песні, а вершаваныя шматрадкоўі з хуткім рытмам, жартаўліва-гумарыстычным зместам. Яны не спяваюцца, а прыгаворваюцца, вымаўляюцца ў рытме пэўнага дзеяння, рухаў, якія пры гэтым выконваюцца. Акрамя таго, праз забаўлянкі падаваўся пазнавальны матэрыял, закладваліся асновы маральнасці і норм паводзін у будучым жыцці, адбывалася знаёмства з багаццем роднай мовы, што сведчыць пра глыбіню народных ведаў па педагогіцы і псіхалогіі дзіцячага ўзросту. З дапамогай забаўлянак вырашаліся тры асноўныя задачы выхавання: дзіця фізічна развівалася, вучылася вобразна мысліць, атрымлівала радасныя эмоцыі. Умоўна, згодна з функцыянальнай нагрузкай, забаўлянкі падзяляюцца на асобныя групы: тыя, што прамаўляюцца пры гульні з пальчыкамі і ручкамі дзіцяці; пры гульні з ножкамі; пры казытанні, пагладжванні, гушканні і г. д.[4]

Паўсюль у Беларусі да сённяшняга дня вядома забаўлянка-гульня з ручкамі «ў ладкі/ладачкі», калі ў такт вершаванага прыгавору або песенькі кімсьці з дарослых выконваліся неабходныя рухі — пляскання далонькамі дзіцяці. Забаўлянка прыносіла вялікае задавальненне, радасць, смех — і ў хуткім часе дзіця само, без дарослых, пачынала пляскаць у ладкі, ледзьве пачуўшы першыя словы забаўлянкі. Другая вельмі папулярная ў беларусаў забаўлянка-гульня з пальчыкамі, якая таксама суправаджалася рытмічнымі прыгаворамі-песенькамі, — «Сарока-варона», калі «варылі кашу» на дзіця-

[3] Дзіцячы фальклор / склад. Г. А. Барташэвіч ; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972. — С. 16–17.

[4] Тамсама. — С. 18–19.

чай далоньцы і дзялілі яе паміж усімі пальчыкамі, пры гэтым абдзялялі кашай гультая, які «круп не драў, вады не насіў, дзяжы не мясіў». Дадзеная забаўлянка з'яўляецца яскравым прыкладам мудрасці народнай педагогікі беларусаў: дзіця ў даступнай для яго ўзросту форме ўсведамляла паняцці дабра і справядлівасці, засвойвала думку, што праца — гэта аснова і неабходная ўмова існавання чалавека.

Практычна ў кожнай сялянскай сям'і ведалі і адпаведныя забаўлянкі, якімі суправаджалася казытанне ножак дзіцяці, напрыклад: «Кую, кую ножку...». Рытмічна прамаўляючы гэты тэкст, дарослы лёгенька пастукваў пальцамі па ступні або пятцы, а потым казытаў падэшву. Праяўляючы клопат аб умацаванні мышцаў спіны, развіцці смеласці ў малога, яго падкідвалі ўверх або гушкалі на назе, што суправаджалася рытмічна пабудаванымі фразамі: «Чук-чук-чук, налавіў дзед шчук...». А якая асалода і для дарослых, і для дзіцяці яго казытанне (часцей «казой» — пальцамі рукі, пастаўленымі, як рожкі), якое заўсёды суправаджалася залівістым дзіцячым смехам. Перад сном, каб супакоіць дзіця, яго лашчылі, пагладжвалі па спінцы зноў жа з прыгаворамі-забаўлянкамі, найбольш распаўсюджаная сярод якіх — «Ласачка».

Па кампазіцыі забаўлянкі неаднародныя. Некаторыя пабудаваны ў форме пытанняў і адказаў, у іншыя ўключаецца дыялог як састаўная частка. Дыялагічная кампазіцыя дазваляе разыгрываць забаўлянкі як невялікія сцэнкі-гульні, гукаперайманні імітуюць ці жывых істот, ці пэўныя дзеянні, а словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі ствараюць атмасферу пяшчотнасці, ласкавасці[5].

У перыяд маленства і дзяцінства найбольш запатрабаванымі з'яўляліся жанры ўласна дзіцячага фальклору — песні, заклічкі, лічылкі, якія выконвалі самі дзеці. Дзіцячыя песні былі разнастайныя па тэматыцы, аднак галоўнае месца сярод іх належала песням, персанажы якіх адносіліся да жывёльнага свету, але паводзілі сябе, як людзі, у зразумелых для выканаўцаў жыццёвых умовах і абставінах. Звяры, птушкі, насякомыя, што дзейнічалі ў песнях (каза і казёл, сіўка-варонка, сойка, дзяцел, камар і інш.), былі добра знаёмыя дзецям і падлеткам, сустракаліся амаль кожны дзень.

[5] Барташэвіч, Г. А. Забаўлянкі / Г. А. Барташэвіч // Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. — Т. 1. — С. 503.

Любімымі ў дзіцячым асяроддзі былі песні-небыліцы, гэта значыць песні з парушэннем устаноўленага стану рэчаў. К. І. Чукоўскі, які спецыяльна займаўся вывучэннем сутнасці небыліц, іх уздзеяння на слухача, прыйшоў да высновы, што гэтая свайго роду гульня ў перавернуты свет цікавая дзецям, ужо знаёмым з сапраўдным станам рэчаў. Яна дапамагала ім канчаткова зацвердзіцца ў пэўных вывадах, добра арыентавацца ў рэальных з'явах[6].

Весела бавіць час дапамагалі так званыя дакучныя песні і песні з гукаперайманнямі. Былі і спецыяльныя дзіцячыя песні, якія спяваліся падчас ваджэння карагодаў: «Заінька да шарусенькі…», «Мы пасадзім грушку…» і інш.

З маленства і да падлеткавага ўзросту ў дзіцячым асяроддзі пастаянна гучалі заклічкі — кароткія прыгаворы, песенькі з канкрэтнай просьбай, адрасаваныя сонцу, дажджу, насякомым, птушкам, раслінам. Даведацца аб надвор'і спрабавалі, звярнуўшыся да божай кароўкі ці бусла. Пры тагачасным ладзе жыцця дзеці і падлеткі на працягу ўсяго сезона былі заняты збіраннем грыбоў, падчас якога выкарыстоўваліся спецыяльныя прыгаворы. Для выканання дзіцячых заклічак характэрна не столькі спяванне, колькі рэчытацыя. Яны рытмізаваны, прыстасаваны паводле сваёй будовы да калектыўнага выканання. Лаканічнасці тэкстаў адпавядае канкрэтны слоўнікавы склад[7].

Надзвычай прадуктыўным жанрам дзіцячага фальклору з'яўляюцца лічылкі. Каб хутка і справядліва вызначыць ролі ўдзельнікаў гульні, у кожным дзіцячым калектыве выкарыстоўваліся лічылкі — невялікія вершаваныя творы, найчасцей гумарыстычнага характару. Той, хто прыгаворваў лічылку, указваў па чарзе на кожнага ўдзельніка, і пры словах, напрыклад, «Выйдзі вон з карагоду», «Той вон пойдзець», «Выйдзі, князь», выходзіў удзельнік гульні, на якога гэтыя словы выпалі, становячыся вядучым або выбываючы з гульні (у залежнасці ад дамоўленасці). У гульні лічылка мела сілу няпісанага закону, якому ўсе ўдзельнікі павінны былі падпарадкоўвацца. Прамаўленне лічылкі з'яўлялася цікавым, займальным для выканаўцаў, бо ў ёй утрымлівалася і лічэнне, дзе на кожную лічбу давалася рыфмаваная фраза, і рытм, што

---

6 Чуковский, К. И. От двух до пяти / К. И. Чуковский. — Минск : Учпедгиз БССР, 1957. — С. 219–228.

7 Барташэвіч, Г. А. Заклічкі / Г. А. Барташэвіч // Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. — Т. 1. — С. 514.

вызначаў правільнасць пераліку. Лічылкі дзецям было лёгка вымаўляць, бо словы ў іх падбіраліся найперш з галоснымі гукамі, без збегу зычных. Некаторыя лічылкі, самі не даючы пераліку, патрабавалі яго ў адказе на пытанне, напрыклад: «Колькі патрэбна гваздзей, кажы хутчэй» і інш.

Усе лічылкі паводле наяўнасці або адсутнасці ў іх сюжэтнага стрыжня падзяляюцца на дзве групы: сюжэтныя і бессюжэтныя. У лічылках, асабліва сюжэтных, шырока прадстаўлены жывёльны свет (курыца-квактуха, зязюля, кошка, жабка і інш.). Сустракаюцца і такія персанажы, як злодзей, маленькі панок, Малання, цар, князь[8]. У якасці лічылак ужываліся і кароткія песенькі — тады абранне вядучага адбывалася па апошнім слове, напрыклад: «На красным месцы яечка знесці».

У кнізе прадстаўлены найбольш тыповыя калыханкі, забаўлянкі, дзіцячыя песні, заклічкі, лічылкі, якія ў мінулым былі шырока распаўсюджаны ў традыцыйнай беларускай сям'і, дзіцячым асяроддзі, вясковай супольнасці. Аўтары спадзяюцца, што гэтыя фальклорныя творы і сёння прынясуць шмат радасці дзецям і іх бацькам, а прынцыпы, нормы, ацэнкі народнай педагогікі, увасобленыя ў дзіцячым фальклоры, будуць пакладзены ў падмурак тэорыі і практыкі выхавання сучаснага падрастаючага пакалення.

[8] Барташэвіч, Г. А. Лічылкі / Г. А. Барташэвіч // Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2005. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва — «Яшчур». — С. 46.

前言

生育与培养孩子一直是白俄罗斯家庭的主要目标。在民族文化中孩子从来都被认为是上帝赐予的礼物，家庭幸福的象征，传宗接代（即永存）的希望。有孩子就会有晚辈照顾的长辈，有耕好的田地，在爷爷奶奶的房子里就会有孙子快乐的笑声。

传统农业的社会历史中制定了培养孩子和青年的最佳的教育系统，即民间教育学。儿童民间创作是培养孩子的有效方法之一。世代使用的民间教育学的主要功能是传递生活技能和关于自然、人物、生活环境的知识。在白俄罗斯民间教育学中婴儿和儿童年龄段分成五个时期：婴幼儿时期包括从出生之际到2-3岁，在官方教育学中称作 “怀抱教育” 或者“母亲教育”；儿童早期 ：从2-3岁到6-8岁，官方教育学的名称是“游戏——模拟时期”；儿童时期或者牧童时期：从6-8岁到12-14岁，官方教育学的名称是“帮工时期”；半大孩子的时期：从12-14岁到16-18岁，“专业工作、掌握多方面生活技能的时期”；少年时期：从16-17岁到18-21岁，“已预备好独立生活、工作劳动、成家立业的人”。我们的祖先对孩子在每个成长阶段上有哪些体力、心理、情感、智力发展的特点的理解都很深刻。最近白俄罗斯民间知识受到了官方教育学的证明。比方说，从我们祖先的角度来看，在孩子发展过程中，婴幼儿时期算是最重要的年龄阶段之一。在婴幼儿时期需要用摇篮曲和童言体，即民间创作研究者叫作的“母亲创作的作品”或者成年人为孩子创作的作品。

在传统白俄罗斯家庭中，孩子从出生之际，母亲或者奶奶就开始为孩子歌唱摇篮曲。摇篮曲的作用不仅是安慰孩子，让他睡觉，而且是孩子认识亲人世界的原始形式。孩子听了摇篮曲，就学会了为认识周围世界、发展思维能力所必需的最初词汇量。摇篮曲也是孩子认识母语及其诗学和音乐学特点的方式。我们的祖先愿意为孩子创造温情和柔和的环境，所以大部分白俄罗斯摇篮曲的发声都很温和。白俄罗斯诗人尼罗·格列维奇写道：“母亲的永爱歌儿的时候，就不知不觉地想，可能这首歌儿的最简单和完整的音调就是人的起点”[1]。现在已经证明的是出生后第一个月之内所安慰

[1] 尼罗•格列维奇“我们家乡歌儿” — 明斯克，1968年。— 第173页。

婴儿的摇篮曲的特殊声音结构，会永远留在他的潜意识中，将作为和谐、安详、幸福的体现。这种感觉虽然是潜意识的，但在困难危险的情况下会提供支持和保护。

摇篮曲的百科全书定义如下："母亲或者奶奶唱的短歌儿，主要功能是安慰孩子、哄他睡觉"[2]。摇篮曲实际功能形成了歌曲结构、音调和节奏简单的特点，以及内容有趣易懂。摇篮曲是非常古老的作品，包含念咒成分和神话的意象如"варкота"（哇尔柯泰，"睡梦"的意思），副歌总是包含"баю, бай, баюшкі"这几个词（源于古俄罗斯的动词"баяць"，是"讲"的意思）等。在摇篮曲中"哇尔柯泰"（睡梦）做为有生命的，会随着猫来到或者随着保姆的请求而自己来到孩子身边。

摇篮曲给孩子介绍周围世界的野兽、鸟、及其行为和有趣的事情。摇篮曲事实上介绍的东西、动物、自然现象并不多。白俄罗斯摇篮曲最普遍的意象是猫、鸡、鸽子。大部分作品中最常见的主角是猫，因此"唱摇篮曲"相当于"唱猫"。以前有这样的习俗：把婴儿第一次放到摇篮里以前，先要放一只猫，以后婴儿在摇篮里一定会睡得很香。几乎所有的房子里都有猫，这是孩子认识的第一个动物。在摇篮曲中猫是一位期望的客人、女人的助手，因为女人叫猫帮她哄孩子睡觉。摇篮曲强调猫对孩子的关心，不仅叫睡梦来，而且做各种家务：女主人让猫到市场去"给玛尼亚买煎包子"，或者到外面去"给玛尼亚买甜面包"。在白俄罗斯摇篮曲中猫帮主人纺线、织布、打谷。通过猫的帮助潜移默化地教孩子基本的行为模式。

除了猫以外，别的常见的主角是鸟：鸡、鸽子，或者"咕哩——吴哩"（гулі-вулі），它们也算是孩子的保护鸟。在摇篮曲中鸟带来各种礼物："黑马"、"幸福的时刻"等。摇篮曲还包含有小牛、兔子、犍牛。灰狼是恐吓孩子的象征。可是白俄罗斯摇篮曲并不包含让孩子受恐和或者危害孩子健康的可怕东西。像童话一样，摇篮曲中的动物和物体都是人格化的，和人一样会说话、会进行各种活动。

摇篮曲的形式和艺术特点取决于摇篮曲的作用：以单调的曲调和均匀的节奏安慰孩子。摇篮曲都有很简单的结构，富有表情的节奏和音韵。摇

[2] 巴尔塔什维奇"摇篮曲"//"白俄罗斯民间创作"，2卷/帕舍阔夫等编辑，第1卷。— 明斯克：白俄百科出版社，2005. — 第620-621页。

篮曲的节奏像摇篮的摇晃动作似的。摇篮曲的情节常常是模糊的，没有具体的说明或者完整性。像其他儿童读物一样，摇篮曲的特征是叙述性。许多摇篮曲包含孩子需要的具体信息。另一个特征是幽默性、绝妙的讽刺。摇篮曲特别常用的是韵，特别是偶韵。摇篮曲的悦耳性和温柔性由词和音的重叠、指小表爱后缀的词儿的使用而产生的。常见的还有拟声词[3]。

根据白俄罗斯民间教育学的准则，培养健康、乐观和快乐的人的关键是保持孩子的良好情绪。为了达到这个目的，我们的祖先想出各种各样的游戏话，与体操和特殊按摩结合相结合。游戏话和摇篮曲的作用是相反的。游戏话的作用是和孩子玩儿，使他高兴，引起他的积极性。所以游戏话的形式不同于摇篮曲的单调结构。这不是一首歌儿，而是一首押韵的诗，拥有快速和玩笑的内容。游戏话不是唱的，而是按照同时做的具体动作的节奏说出的。除此之外，游戏话还包括有意思的信息，介绍将来生活的基本道德和行为准则、蕴含丰富的母语。这些特点证明人民对儿童心理学和教育学具有深刻知识。说游戏话就可以达到三个目标：促进孩子的体力发展，增强孩子的形象思维和形成快乐的情绪。可以把游戏话假定分为几个部分：吸引孩子手和指头的游戏，吸引孩子脚的游戏，挠痒痒，爱抚，摇孩子等[4]。

在白俄罗斯各地至今都有　　“打麦游戏“，与孩子的手玩儿的。成年人或者岁数较大的孩子拿小孩子的手鼓掌，合着歌儿或者数数儿儿歌的节拍。这个游戏使孩子非常高兴，快乐，很快孩子只要听到了游戏话就会自己鼓掌了。另一个受白俄罗斯人欢迎的手指游戏是“喜鹊——乌鸦”，一边说游戏话一边玩游戏。游戏话的意思是在孩子的掌上　　“做粥”，后来把“粥”分给每个指头　，但是不给懒的指头因为它“不种米，不带水，不揉面”。这个游戏是民间教育学的明显例子，通过孩子容易懂的形式教孩子道德和公平的准则，以劳动为主的生活原则。

在每个农民家庭都玩游戏，一边挠孩子的脚一边说：“咯吱，咯吱小脚……”。有节奏地说着这句话，成年人轻轻地打孩子的脚底或者脚后跟，挠他的脚掌。为了加强孩子的背肌、使孩子勇敢，用一只手把孩子向上抛，或者在腿上摇动，说着：“吁，吁，吁，祖父捕狗鱼”。成年人和

3　“儿童民间创作” — 明斯克，1972年。— 第16-17页。
4　同上。

孩子挠痒痒（大多是“摇滚手势”）的动作使成年人和孩子都很快乐，孩子总是发出响亮的笑声。睡觉以前，安慰孩子的方式是说着游戏话（最普遍的是“小燕子”），抚摸孩子的背。

游戏话的结构不相同。有的游戏话由问题和回答组成的，有的除了对话还有别的部分。以对话为主的结构可以把游戏话变成小剧本，拟声词模仿活着的东西、及其动作，用指小表爱后缀的词创造温柔气氛[5]。

在儿童早期和儿童时期最需要的是孩子自己唱的各种儿童创作的作品：儿童歌儿、号召歌、数数儿的儿歌。儿童歌儿的题目多种多样，但是最突出的是以动物为主角的歌儿。动物在各种生活情况下像人一样处理事情。歌儿里的野兽、鸟、昆虫（蚊子、母山羊和公山羊、乌鸦、松鸦、啄木鸟等）孩子每天都可以见的，所以对它们很熟悉。

孩子很喜欢唱寓言歌儿，即有奇怪内容的歌儿。专门研究过寓言本质的科尔涅·伊万诺维奇·楚科夫斯基，得出一个结论：已经认识现实世界的孩子对“倒的世界”的游戏很感兴趣。寓言帮孩子证明他得出的结论，好好地了解实际生活[6]。

有拟声词的歌曲和所谓的讨厌歌也是孩子娱乐方式。还有跳轮舞时唱的特殊童歌儿：“灰色的兔子……“，”咱们种梨树吧……“等。

从儿童时期到半大孩子时期孩子都可以听到号召歌——含有对太阳、雨水、昆虫、鸟、植物提出的某某要求的短歌。为了知道天气会是什么样的，而问瓢虫或者鹳。以前孩子和少年在夏天和秋天的时候都是要采蘑菇的，采蘑菇时也有专门说法。儿童号召歌不是唱的，而是陈述调的，有节奏，很适合共同扮演。歌曲的言简意赅取决于特殊词汇的使用[7]。

数数儿的儿歌是一种大有效果的儿童创作作品。为了又快又公平地挑选游戏的参加者，孩子常用数数儿的儿歌——押韵的短歌，通常都是幽默性的。说数数儿儿歌的人按顺序地指向每个游戏者，一说“从环舞里出去吧”或者“王，你出去吧”，一个人就被出局了。那个离开人的就要重新开始游戏或者变成游戏主持人（取决于游戏的规则）。在游戏中数数儿的儿歌是所有的参与者都应该执行的不成文法。说数数儿的儿歌对孩子很有

5 巴尔塔什维奇“游戏话”//“白俄罗斯民间创作”，2卷/帕舍阔夫等编辑，第1卷。— 明斯克：白俄百科出版社，2005. - 第503页。

6 楚科夫斯基“从2岁至5岁” — 明斯克，1957年. — 第219-228页。

7 巴尔塔什维奇“号召歌”//“白俄罗斯民间创作”，2卷/帕舍阔夫等编辑，第1卷。— 明斯克：白俄百科出版社，2005. — 第514页。

意思，因为包括数的过程，而且每个数字都是与有节奏和押韵的一句话结合的。这种儿歌对孩子很简单，因为歌中的词大部分都有元音，没有很多辅音。有的数数儿的儿歌里面没有列举，列举就在回答里面，比如：“需要几个钉子，你快说吧”等。

数数儿的儿歌分成两个部分：有情节的歌和无情节的歌。数数儿的儿歌，特别是有情节的歌包含各种动物：鸡、杜鹃、猫、蛤蟆等。主角中间还有小偷、地主儿子、玛兰尼亚、沙皇、王[8]。短歌也可以作为数数儿的儿歌，说出最后一个词的时候就会被挑出来，比如“在最好的地方下蛋”。

本书包括了传统白俄罗斯家庭在农业社会里最常见的摇篮曲、游戏话、儿童歌儿、号召歌、数数儿的儿歌。作者希望这些民间创作的作品现在也可以使孩子及其父母十分愉悦，民间教育学的准则和评价可以为培养正在成长的一代的理论与实践打下基础。

8 巴尔塔什维奇“数数儿的儿歌”//“白俄罗斯民间创作”，2卷/帕舍阔夫等编辑，第2卷。— 明斯克 ：白俄百科出版社，2006. — 第46页。

INTRODUCTION

iving birth and raising children were the main purposes for a Belarusian family. As for the folk culture, a child has always been deemed as a gift from God, a blessing for the family, the embodiment of happiness, a means by which the family line continued and was closely associated with the notion of immortality. Having children meant having help and support while getting older and weaker, being sure the land was worked and hearing at home the jolly laughter of grandchildren.

Over centuries the traditional agricultural society has worked out the best principles for the educating of children, teenagers and youth — folk pedagogics. Folklore for children was one of the most efficient educational means. The generations of tested and verified folk pedagogics were supposed to provide the transmitting of the necessary work skills as well as the knowledge about nature, the human being and the world around. As for the Belarusian folk pedagogics the periods of childhood and growing-up are subdivided into 5 main stages: 1) *early infancy* — from birth up to 2–3 years old, the official pedagogics term later called this period the "nanny time", "or "mummy period"; 2) *infancy* — from 2–3 up to 6–8 years old, according to the official pedagogics — "game and imitation period"; 3) *childhood or the herder period* — from 6–8 up to 12–14 years old, "subsidiary work period"; 4) *teenage* — from 12–14 up to 16–17 years old, "socialized work period, all round preparation for life"; 5) *youth* — from 16–17 to 18–21 years old, "a person that is ready for life, productive work and family starting". Our ancestors were well-aware of the peculiarities that accompany the period of physical, psychological, mental and emotional development of a child as well as of each stage of the growing-up process. Later the empirical knowledge has been confirmed by the official pedagogics. For instance, our forefathers considered early infancy to be of crucial importance for the child's development. At the period of early infancy, lullabies and funny poems (later

called by the folklore researches "mother folklore" or "adult folklore for children") were of the most frequent use.

As for the traditional Belarusian family, from the very first day at home the child's mother or grandmother sang to him/her lullabies. The lullaby was not just a means of calming down and tenderly cradling the baby; it was a means for the first introduction into the family world. Children listened to the lullabies and acquired the initial vocabulary, which is a must-have in order to study the world around and develop thinking processes. Lullabies were exactly the tool that helped a child to learn the native language and its poetical and musical features. Our forefathers wanted a child to feel comfort and tenderness, hence the majority of the Belarusian folklore lullabies sounded soft, were kind and tender. "Listening to such a song..." wrote the Belarusian national poet, Nil Hilevich, "...that eternal and immortal canto of 'Mother Love', one inevitably thinks: it may be exactly from that very lullaby, that simple and at the same time absolutely genius melody that a person begins"[1]. It is known today that under the first month of life the lullaby melody with its special musical harmony calms down the baby and stays in the subconscious as a symbol of internal harmony, peace and happiness. It is exactly this lullaby (just unconscious!) that keeps a person from despair at difficult moments and in this regard, guards his/her life.

As for the lullaby encyclopaedia definition, it is: "mainly short songs with quite explicit practical function — to calm down the child, cradle, lull to sleep, sung by a mother or a nanny"[2]. The routine need of lullabies predetermined their closeness to daily life and brought about the song forms, first and foremost its rhythm, comprehensible content, simple composition and entertaining component. The lullabies have an ancient origin which is demonstrated by a spell-like form some of them possess, as well as by the mythical images of "Purr" and "Doze" that one hears; a refrain — "bayu, bai, bayushki" comes from the old russian verb "bayats" (old form of "tell"), etc. Lullabies describe "Purr" and "Sleepy Doze" as animated creatures that could come to nurse a child when a nanny asks for it, they could also be brought by a cat, in a basket, etc.

---

1 Hilevich, N. S. Our Native Song / N. S. Hilevich. — Minsk : Har. asveta, 1968. — P. 173.

2 Bartashevich, H. A. Lullabies / H. A. Bartashevich // Belarusian Folklore : encycl. : in 2 vol. / ed. Board. : H. P. Pashkou [et al.]. — Minsk : BelEn, 2005. — Vol. 1 : A cappella – Kutia. — P. 620–621.

Lullabies introduced the child to the world around them, narrated about the domestic and wild animals and birds, including their actions and adventures. The plots used to describe the same poeticized characters, subjects and natural phenomena. Among the most widespread Belarusian lullabies' images, one can name the cat, hens and pigeons. Yet the main character of the majority of works was the cat and that is why "to sing a lullaby" in Belarusian may sound the same as "to sing a cat". There was even a tradition: in order to provide a baby with a good night's sleep, before laying him/her in the cradle for the first time, one would put a cat in it. Almost every peasant household had a cat; it was the creature that a child got introduced to first. Lullabies depicted a cat as a welcome guest in the house, a helper to the woman, it was called to lull to sleep and cradle a child. Lullabies highlighted the careful manner in which a cat behaved towards the child; it was not only called up for sleep but many other services as well: a cat went to "the shop to bring Mary a lollypop" or to the fair "to bring Mary footwear". Cats from the lullabies took part in the household work, helped the hosts to spin, to weave, to thresh. In that gentle and tactful way, through the cat's actions the child was taught basic behaviour skills.

Besides the cat, birds, like hens, pigeons or "huli-vuli" (Belarusian for "cootchy-cootchy-coo") were some of the favoured characters featured in lullabies. Birds as well took a big part in watching and guarding the child. When they came flying in lullabies, hens and "huli-vuli" brought to children different presents, starting from "the black horse" and up to "a happy minute". Apart from the above mentioned heroes, lullabies had a cowie, a bunny, a horsey and the grey wolfie, the latter was used as a precaution/threat in case a child didn't behave. Yet none of the lullabies have any mention of beasts which could actually scare the baby and cause harm to his/her health. In the same way, as in tales, subjects and animals were humanized in lullabies, they acted, talked and related to each other as if they were people.

The lullabies' forms and literary features were preconditioned by their purpose — to calm down the baby by monotonous singing and slow rhythm. All of the lullabies possess quite simple composition, distinct rhythm and exceptionally rich stock of beautiful rhymes. The lullabies rhythm managed to imitate cradle

swinging. Some of the lullabies don't have a finished plot from the beginning to the end of its story. As in many other works for children, lullabies used a narrative structure. Plenty of them delivered quite definite information, which was interesting and necessary for the child. Subtle irony and humour are characteristic features of lullabies as well. The songs are usually rhymed and the plain rhyme is the most widespread one. Special melodiousness and tenderness of lullabies is created by repetition of definite words and sounds as well as by using diminutive suffixes. Last but not least one should mention onomatopoeic words that are often used for the lullabies' structure[3].

According to the Belarusian national pedagogics in order to bring up a healthy and cheerful person, the child should be encouraged in keeping joyous emotions when feeling lively. For that purpose our forefathers made up a great deal of different amusing rhymes that came together with some physical exercise and special massage. Amusing rhymes strived for an absolutely different effect than lullabies. These should have amused and diverted the child's attention, make him/her cheerful and roused, that's why their form differs from the one of melodious and monotonous lullabies. These verses remind sooner of multiline rhymes with speedy rhythm than of songs. Amusing rhymes feature humorous plots and are usually pronounced in line with the rhythm of the action or movement performed at that moment. Moreover, amusing rhymes contained an educational component, explanations of moral principles and rules of conduct for the benefit of future life. Apart from that, a child got acquainted with native language richness. The amusing and educational approaches which had been worked out, demonstrate a deep understanding of pedagogics and child psychology. An amusing rhyme accomplished three tasks at the same time: developed the child physically, taught logical and visual thinking and gave joyful emotions. One can single out special and amusing group from the rhymes: playing with the child's hands and fingers, playing with the child's feet; tickling, stroking, swinging, etc.[4]

To date, all over Belarus each and everyone knows of the amusing game played with the hands of a child "u ladki" (hand-clapping game, similar to "pat-

[3] Folklore for Children. — Minsk : Navuka i technika, 1972. — P. 16–17.
[4] Ibid. — P. 18–19.

ty-cake"), following the rhyme or song rhythm an adult or an elder child claps the baby's hands. The child would rejoice, become cheerful, burst into laughter and soon start to clap their own hands directly after hearing the first few lines of the rhyme. Another popular Belarusian entertainment for the child was playing with the baby's fingers while reading out the amusing lines of a rhyme, such as: "saroka-varona" (in approximate translation "once a magpie baked a pie", or pointing out each finger of the baby's palm while saying "we've been cooking porridge" and in the end not giving any "porridge" to the lazy finger that "didn't beat the grain, didn't bring the water, didn't knead the dough". That amusing rhyme is one of the brightest examples of Belarusian national pedagogics' wisdom: using a comprehensible way, appropriate for the child's age, a baby was taught the notions of good and justice, what is more, the principle of working was conveyed as an integral constituent of human life.

Almost without exception, peasant families knew the necessary amusing rhymes for baby feet tickling, such as: "shoeing, shoeing footsie". While repeating the rhyme, an adult gently knocked, with their fingers, a baby's foot or heel or tickled the sole. In order to strengthen the back muscles and develop courage in an infant, an adult threw him/her up with one hand while carefully supporting the infant with the other hand, or bounced astride the knee repeating the rhymes "lai-di-lai, grandpa catches pike...". And what a pleasure, for both a child and a baby, a tickling game (most often with the "goat" — finger horns), a game that has always been accompanied by a child's laughter. To calm down a baby before sleep, an adult stroked the baby while repeating another sort of rhyme for amusing and calming, the most popular among them named "Lasachka" (a word-play: "least-weasel" and "caress" sound the same in Belarusian).

The composition of amusing rhymes differs from verse to verse. Whereas some of them are built in the question-answer form, others have dialogue as just a small part of the rhyme. The dialogue-like structure permits to play amusing rhymes as short funny performances, onomatopoeia imitates actions or living beings and diminutives create the atmosphere of tenderness and caress[5].

[5] Bartashevich, H. A. Amusing Rhymes / H. A. Bartashevich // Belarusian Folklore : encycl. : in 2 vol. — Vol. 1. — P. 503.

Folklore for children in the form of songs, counting-out and appealing rhymes performed by children themselves became especially popular under the periods of infancy and childhood. The children's songs used to have different themes, yet mainly the characters belonged to the animal kingdom although behaved like humans. The animals, birds and insects (he- and she-goat, grey-crow, jay, woodpecker, etc.) that took part in the narrations were well-known to children and teenagers and a were part of their daily life.

Cock-and-bull songs were most beloved among children; these songs demonstrated absolute inversion in the order of things. K. I. Chukovsky paid special attention to studying of how cock-and-bull stories affect the listener and came to the conclusion that such stories are especially appealing to the children that are already well-aware of the regular order of things. These stories help them to be sure of the conclusions they've made and to get a better understanding of the events in real life[6].

So-called annoying songs and onomatopoeic songs were other ways to have a good time. There were special children's songs sung while dancing in a circle: "Greyish little bunny...", "Let us plant a pear tree...", etc.

From infancy to adolescence, appealing rhymes — short verses and songs addressing the sun, the rain, insects, birds and plants with some special request — could be heard in children's circles. In order to get the weather forecast, one sought for a ladybird or a stork. The day-to-day of that time involved picking mushrooms by children and teenagers during the whole season, for that purpose special appealing rhymes were used. As for performing, appealing rhymes were sooner recitatives than songs. The verses had rhythm and were adapted for the collective performing the rhyme. Laconic texts contained certain vocabulary[7].

Counting-out rhymes were an especially useful genre of the folklore for children. Each company of children used counting-out rhymes in verse, mostly of

---

6 Chukovsky, K. I. From two to five / K. I. Chukovsky. — Minsk : Uchpedgiz BSSR, 1957. — P. 219–228.

7 Bartashevich, H. A. Appealing Rhymes / H. A. Bartashevich // Belarusian Folklore : encycl. : in 2 vol. — Vol. 1. — P. 514.

humorous content, to quickly decide the positions for every participant of the game. The one that was pronouncing the rhyme pointed in turn to each participant and after saying, for example: "Step out from the circle", "This one steps out", "Go out, Knyaz" (Knyaz — a Slavic noble title, a prince) the participant that got pointed to was either out or became the leader (depending on the previous agreement). The counting-out rhyme was a non-written law ruling over all of the game participants. The rhyme pronouncing was a captivating process as it was embracing counting and the use of a rhymed phrase for every figure as well as a special rhythm that predetermined correct counting. The verses were easy to pronounce as they were composed mainly of vowels without difficult consonant combinations. Some of the rhymes were not actually counting yet demanded the count when answering, for example: "hey say, how many nails", etc.

All the counting-out rhymes are divided into two groups depending on the presence or absence of the plot: plotless or with a plot. Especially the rhymes with widely used plot characters from the animal world: cluck-cluck hen, cuckoo, cat, toad, etc. There were villains, little master, Malannya, tsar and knyaz[8]. Short songs were also used as counting-out rhymes — in that case the leader was chosen by pronouncing the last word, for example: "lay eggs in the best place".

Our book presents the most common lullabies, amusing, appealing and counting-out rhymes and songs for children that were popular among traditional Belarusian families, children and peasantry in former times. The author's hope is that even today, presented folklore works will be able to bring joy to both children and their parents, whereby principals, norms and national pedagogics' standpoints expressed by the folklore for children will be used as a theory and a training ground for the upbringing of a younger generation.

[8] Bartashevich, H. A. Counting-out Rhymes / H. A. Bartashevich // Belarusian Folklore : encycl. : in 2 vol / ed. Board. : H. P. Pashkou [et al.]. — Minsk : BelEn, 2006. — Vol. 2 : Traditional Art Studio — "Yashchur". — P. 46.

КАЛЫХАНКІ
搖篮曲
LULLABIES

Мастак А. Стальмашонак

бел.

А... а..., люлі, а... а..., люлі.
Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сізенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць.
Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночку міленькі,
Ой, да люлі-люленькі...
Ўспомніш матку ты сваю,
Як цябе люляла,
Як табе у ноч не раз
Песню я спявала.

кіт.

啊…… 啊……，
我亲爱的儿子，
睡吧，小鸽子。
我的儿子睡得香，
我把儿子摇。
大风啊，为什么你呼呼呼，
不让我米哈希睡觉觉？
睡吧，我亲爱的儿子，
你要记得妈妈来，
怎么哄你快入睡，
整夜给你唱儿歌。

англ.

A... a..., lyuli, a... a..., lyuli
Sleep, my baby, sleep, my son,
Sleep, my sweetie, my dear one.
Baby shall be sleeping,
Mother shall be lulling.
Wind, please do not howl a strut,
Do not wake Mikhas'ka up.
A... a..., lyuli, a... a..., lyuli...
Sleep, my baby, sleep, my son,
One day you'll recall your Mom
Lulling you to fall asleep,
Singing songs for you all night,
A gentle kiss upon your cheek.

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел. *Хадзіў каток па капусце,*
Насіў сончык ў белай хусце.
Усім сончык прадаваў,
А табе, Зосю, дарма даў.

кіт. 猫在白菜中逛着，
睡梦在白巾上带着。
睡梦它要卖给大家，
但却要送给卓夏。

англ. *The cat walks through the cabbage,*
Dreams in a white kerchief package,
Selling all his dreams with glee,
To you, Zosya, he gives for free.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

Ой ты, коце шэры,
Просім цябе ў сені.
А ты, коце стракаты,
Просім цябе дахаты.
Будзеш у нас начаваці,
Мікалайку калыхаці.

кіт.

啊，灰色的猫，
请到大厅来。
啊，斑纹的猫，
请到家里来。
你在这里休息好，
哄着尼科莱睡觉觉。

англ.

Oh, you, little kitty,
Please come to our seni.
You too, motley kitty,
Here you'll be homely.
As the night goes by,
We'll lull our Mikhalay.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Баю-баю-баенькі,*
Люлі-люлі-люленькі,
Прыляцелі гуленькі,
Селі яны ў люленькі,
Сталі яны гуркатаць,
Дзіцятачка калыхаць.
Маўчы, маўчы, не крычы.

кіт. 宝宝，睡吧，
做许多香梦吧，
一对鸽子飞过来，
坐在摇篮上，
发着咕咕声，
摇着小孩子。
睡吧，睡吧，别哭啦。

англ. *Sleep, sleep, sleep,*
Lyuli, lyuli,
Doves have come,
Come by the cradle,
Started cooing,
Lulling the child,
Hush, hush, hush, don't cry.

Мастак К. Вішнеўская

бел. *Ля коціка варката,*
На малютку сон-драмата.
Ты спі, ляжы, малютка!
Прыйдзі, коцік, начаваць,
Малютачку калыхаць.

кіт. 猫旁边有睡梦，
哄宝宝睡好觉。
宝贝，别动，快睡！
猫，你在这里休息好，
摇着宝宝睡好觉。

англ. *Drowsiness follows the cat,*
Soon to sleep in no time flat.
Sleep, my baby, sleep, my child,
Come cat, come, and stay a while,
While away and lull my child.

Мастак А. Кісляк

бел.

Люляю-люляю,
Я коціка налаю,
Каб ён да нас не хадзіў,
Цябе, дзетка, не збудзіў.
А ты, каток, пайшоў вон,
А дзетачцы аддай сон.
Ходзіць сон каля акон,
А дрымота каля плота.
І пытае сон дрымоту:
— Дзе мы будзем начаваць?
— Дзе хацінка цяпленька,
Дзе дзетачка маленька,
А мы пойдзем начаваць
І дзяцінку калыхаць.

кіт.

我把猫儿骂一顿，
你不要在这儿留，
弄醒我们宝贝儿。
猫，你就出去吧，
把睡梦给我婴儿。
梦在窗户下面走，
睡在篱笆旁边逛。
睡眠问一下瞌睡：
“我们要在哪儿过夜？”
“把暖和的房子找，
把婴儿的摇篮找，
我们在这里休息好，
摇着宝贝儿去睡觉”。

англ.

Lulling, lulling,
I will tell the kitten off,
Do not come in from the wild,
Do not wake up our child,
Kitten, please, kitten, flee,
Give a dream to our baby,
Dream is walking by the door,
Drowse is crawling on the floor.
— Where will we spend the night?
— Where home's warmth falls,
Where a small child lies,
It is there that we shall go,
Lull the baby on this night,
Lull the baby to and fro.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

Пайшоў каток у лясок,
Знайшоў каток паясок.
А кошачка адняла
І дзіцяці аддала.
Пайшоў каток на таржок,
Знайшоў каток піражок:
Ці самому есці,
Ці дзіцяці несці?
І сам трошкі укусіў,
І дзіцяці прынасіў.

кіт.

猫到林子去溜达，
发现一条带子。
但被母猫夺走了，
交给小孩子。
猫到市场去，
找到一个馅饼，
不知道，该自己吃
还是交给小孩子？
自己咬下一小块，
其他交给小孩子。

англ.

The cat went into the wood,
The cat there found a hood.
But his mother took it away,
And to our baby there she gave.
The kitty-cat went to the market,
Found there a bun in a basket.
Should he eat the bun himself,
Should he take it to the child?
He himself bites off a bit,
The rest he gifts to our dear kid.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Люлі-люлі, цэлы дом спіць,
А каток на печы сон сніць.
Люлі-люлі-люлі.
Ціха, мышка, варушыся,
Бо каточак прытварыўся.
Люлі-люлі-люлі.
Як пайшоў каток на ганак,
Знайшоў маток абаранак.
Люлі-люлі-люлі.
Таму-сяму прадаваў,
А Манечцы дарма даў.
Люлі-люлі-люлі.
Скочыў коцік у мякіну,
А Манечка – у пярыну.
Люлі-люлі-люлі.

кіт.

家人都睡着，
猫在炕上做着梦。
老鼠，轻轻动，
因为猫装睡。
猫到门廊去，
找到面包圈。
卖一个，卖两个，
但是送给玛涅奇卡。
猫在谷糠跳，
玛涅奇卡在羽毛褥子跳。

англ.

Lyuli-lyuli, house is sleeping,
The cat's on the stove softly dreaming.
Lyuli-lyuli-lyuli.
Quietly, mouse, move around,
By the cat you can be found.
Lyuli-lyuli-lyuli.
The cat went to the porch,
Found there a batch of rolls.
Lyuli-lyuli-lyuli.
Rolls he sold to everyone
And to Manechka gave one.
Lyuli-lyuli-lyuli.
The cat jumps into the hay, spry,
A feather bed, where Manechka lie.

Мастак К. Вішнеўская

бел. *Пайшоў каток пад масток,*
Злавіў рыбку за хвасток.
Ці самому з'есці,
Ці Танечцы прынесці?
Я й сам разок укушу,
І дзіцяці аднясу.

кіт. 猫到桥下去，
抓住鱼尾巴。
不知该自己吃
还是带给小塔娜？
我就咬下一小块，
其他带给小孩子。

англ. *Kitty-cat went to the bridge,*
There, caught a fish with a jig.
Should he eat up all the fish,
Or take home and make a dish?
I shall bite off one small piece,
And for Tanya make a feast.

Мастак К. Вішнеўская

бел.

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах
У чырвоных ботах,
Сталі сакатаці,
Трэба есці даці:
Ці гароху троху,
Ці ячменю жменю,
Ці аўса ў лубені,
Ці грэчкі з засечкі.

кіт.

一群鸡飞来，
穿着红靴子，
坐在门扇上，
鸣起来，要饭吃：
给鸡一把豌豆吃，
还是给鸡大麦吃，
还是给鸡燕麦吃，
还是给鸡荞麦吃。

англ.

Lyuli-lyuli-lyuli,
Here come some hen,
Wearing red boots,
Sitting on the gate,
Clack, clack,
They should have a snack:
A handful of pea,
Or a fistful of barley,
Or some oats from the sack,
Or some buckwheat from the bag.

Мастак А. Стальмашонак

бел.

А-а, люлі-люлі,
Прыляцелі гулі,
Селі яны ў люлі,
Сталі яны гуркатаці,
Дзяціну калыхаці.
Гойда-гойда, люлюсенькі,
Мой сыночак малюсенькі,
Гойда-гойда-гойдада,
Дзіця маё кахана.

кіт.

鸽子飞过来，
坐在摇篮上，
发出呜呜声，
陪宝宝睡觉觉，
摇啊，摇啊，
我的小儿子，
摇啊，摇啊，
我的好宝贝。

англ.

A-a, lyuli, lyuli,
A dole of doves here come.
On the cradle perching,
Started quietly cooing,
Our baby they're lulling.
Lulling, lulling,
Little son,
Lulling, lulling,
Dear one.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

Люлі-люлі-люленькі!
Прыляцелі гуленькі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі яны варкаваці,
Чым дзіцятку гадаваці.
Няхай яму пташкі
Прыгатуюць кашкі!

кіт.

一对鸽子来，
坐在大门口。
穿着红靴子，
发出呜呜声，
鸽子互相问，
孩子吃点啥，
最好给孩子
煮上一些粥！

англ.

Lyuli, lyuli, hush, my child,
Two doves came before the night,
Sitting on the gates, up high,
They wore red boots in twilight.
Started cooing, cooing,
What will they be cooking.
For our little baby
Porridge will do, maybe.

Мастак К. Вішнеўская

бел. *Баю-баю-баінькі,*
Прыскакалі заінькі.
— Ці спіць ваша дзевачка,
Дзевачка-прыпевачка?
— Адыдзіце, заінькі,
А мы будзем баінькі.

кіт. 宝贝，你睡吧，
兔子跳过来，
问我们：
“宝贝女儿
在哪儿睡着了？”
“兔子啊，你们回去吧，
我们就要睡着了”。

англ. *Hush, hush, sleep, my child,*
Here several bunnies come.
— How is our dear girl?
Is she sleeping?
— Not at all,
You should better go away,
Girl should sleep, you cannot stay.

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел.

А-а-а, люлі-люлінькі,
Да пабег зайчык у лясочак,
Да знайшоў зайчык паясочак.
Трэба зайчыка паймаці,
Да паясочак адабраці
І хлопчыку аддаці —
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад ліпку,
Да знайшоў сабе скрыпку.
Трэба зайчыка паймаці,
Скрыпачку адабраці —
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад грушку,
Да знайшоў сабе падушку.
Трэба зайчыка паймаці,
Да падушку адабраці —
Стане хлопчык спаці.
А-а-а, люлі-люлінькі.

кіт.

兔子在林子跳，
找到一条带子，
我们必须捉住兔子，
拿走带子，
交给孩子，
他就快睡着。
兔子在椴树跳，
找到一把小提琴。
我们必须捉住兔子，
拿走小提琴，
交给小孩子，
他就快睡着。
兔子在梨树跳，
找到一个枕头。
我们必须捉住兔子，
拿走枕头，
交给孩子
他就快睡着。

англ.

A-a-a, lyuli-lyuli,
Rabbit ran into the wood,
Rabbit found there a hood,
We should catch him in the wood,
And should take away the hood,
Take the hood to our boy,
For he shall sleep with the toy.
Rabbit ran to linden tree,
Found there one green pea,
We should catch him by the tree,
And should take away the pea,
Take the pea to our boy,
For he shall sleep with the toy.
Rabbit ran beside the stream,
Found there one sweet dream,
We should catch him by the stream,
And should take away the dream,
Take the dream to our child,
For he shall sleep warm and mild.



Мастак Х. Іванцова

бел. *Люляй-люляй-люляшынькі,*
Было ў маткі тры Ясенькі:
Адзін гусі пасе,
Другі есці нясе,
Трэці сядзіць на камені,
Трымае трубу на рэмені.
Ой, павешу трубу
На зялёным дубу,
Няхай вецер павявае,
Няхай сама труба грае.

кіт. 母亲有三个儿子，
第一个放着鹅，
第二个带着饭，
第三个拿着喇叭。
我把喇叭
挂在橡树上，
大风刮，
吹喇叭。

англ. *Lyuli-lyuli,*
Mother has three sons:
The first one grazes geese,
The second one brings the fleece,
The third one's sitting on a stone,
Holds a horn and sits alone.
Oh, I'll hang the horn,
On the big green oak,
Let the wind blow,
Let the horn's sound flow.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Баю-баю-баінькі,*
Купілі Тоні валенкі.
Надзенем на ножанькі
І пусцім па дарожанькі.
Будзе Тонечка хадзіць,
Новы валенкі насіць.

кіт. 宝贝儿，睡觉吧，
毡靴买给托尼亚，
穿在小脚上，
托尼亚就走一走，
新的毡靴穿一穿。

англ. *Hush, hush, sleep, my child,*
Bought for Tonya valenki.
Put them on her little feet,
She will walk along the street,
Our Tonya will be walking,
New snow boots adorning.

Мастак К. Вішнеўская

бел. *Баю-баю-баю,*
Не лажыся з краю,
Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Схопіць Колю за бачок.

кіт. 睡吧，我的宝贝儿，
你别躺在床沿这儿，
灰的小狼它会来，
会咬科利亚小孩。

англ. *Sleep, sleep, sleep, my child,*
Do not sleep near the bedside,
For grey wolf may come at night,
Bite my Kolya on the side.

Мастак В. Багнюк

бел. *Баю-баю-бай,*
А ты, Васька, засынай,
А ты, Машка, не хадзі,
А мне Ваську не будзі,
А ты, Васька, моцна спі,
А ты, Машка, не будзі.

кіт. 瓦夏，快睡着，
玛莎，你别跑，
别把瓦夏弄醒，
让他做个美梦。

англ. *Hush, my little, hush, my sweet,*
Vas'ka, quickly fall asleep,
And you, Mashka, don't walk here,
Don't wake Vas'ka up, my dear,
Let him sleep and see sweet dreams,
Mashka, you'd be quiet, please.

Мастак А. Кісляк

бел. *Люлі, люлі, люлі,*
Палез кот па дулі,
Да памерзлі лапкі,
Палез кот на палаткі,
Сталі лапкі грэцца,
Няма катку дзе дзецца.

кіт. 流哩流哩，流哩，
猫爬树上摘下梨，
猫脚掌都冻了。
猫就爬到炕去，
暖和一下猫脚掌。

англ. *Lyuli, lyuli, lyuli,*
The cat climbed up to pick a pear,
But his paws were frozen there,
So he climbed up on the oven,
Paws turned warm all of a sudden,
Nowhere to go for him at home.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Люлі-люлі-люлі,*
Усе дзеткі паснулі,
Адна Танечка не спіць,
Як шэры каток, вурчыць,
І не спіць, і не гуляе,
Усіх дзетак пабуджае.

кіт. 流哩，流哩，流哩，
孩子都睡着了，
只有塔尼亚没睡，
发出猫似的咕咕声，
不睡觉，也不玩，
其他孩子会醒来。

англ. *Lyuli-lyuli-lyuli,*
All the children sleeping sweetly,
Only Tanya awake and stirring,
Like a grey cat, she is purring,
Neither sleeping, nor she's playing,
All the children soon awaking.

Мастак А. Кісляк

бел. *Люлі-люлі, каточак*
Злізаў бабчын мядочак.
Сама бабка злізала,
На коціка сказала.
Пайшоў, коцік, пайшоў вон,
А на Іваньку добры сон.

кіт. 流哩，流哩，小猫咪
蜂蜜被吃光，
奶奶自己吃了，
却说是猫吃了。
猫，你就出去，
带来梦给伊万。

англ. *Lyuli, lyuli, kitty-cat,*
Where is Granny's honey at.
In fact it was Granny who ate all the honey,
The cat didn't find it to be so funny,
Kitty-cat, please, you're so sweet,
Let Ivan'ka fall to sleep.

Мастак А. Стальмашонак

бел.

Хадзі, сонейка, да нас,
Будзе табе добра ў нас.
У нас хата цяпленькая,
А Маруся маленькая.
Люляй Марусю, люляй,
Вочкі стуляй, стуляй.

кіт.

太阳，到这里来，
你在我们这儿就好。
我们房子很暖和，
我们玛鲁夏很小，
摇啊摇，玛鲁夏，
闭上眼睛，快睡着。

англ.

Dear Sun, please, come to us,
You will like to be with us,
Our house, so comfortable,
And Marusya, so little,
Lull Marusya, lull my dear,
Shut your eyes, bring dreams here.

ЗАБАЎЛЯНКІ
游戏话
FUNNY RHYMES

Мастак В. Багнюк

бел.

Ладу-ладу-ладкі.
— А дзе былі? — У бабкі.
— А што елі? — Кашку.
— А што пілі? — Бражку.
Бабулька казала,
Як нас частавала:
— Прыходзьце часцей,
Пачастую ляпей:
Дам вам сыраквашкі,
Бярозавай кашкі,
Піражкоў у маку
І розных прысмакаў.

кіт.

你们去过哪里？
去过奶奶家里。
你们吃了什么？
我们吃了稀粥。
你们喝了什么？
我们喝了家酒。
奶奶做好饭，就给我们说：
孩子，你们常常来，
就给你们酸奶，
甜饼，多多好东西吃，
常常到这里来。

англ.

— Patty-cake, patty-cake.
— Where did you go?
— To Granny's home.
— What did you eat?
— The porridge made of wheat.
— What did you drink?
— A glass of milk.
She gave us this and gave us that
And not just once or twice she said:
— Often come to visit me,
I will give you curdled milk,
Oil of birch, poppy cake,
Tasty dishes I do make.

Мастак В. Багнюк

бел.

Кацюты, кацюты,
Ладушкі-ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі.
— Што рабілі?
— Муку малолі.
— Дзе падзелі?
— Мышкі з'елі.
— Куды панеслі?
— Сюды, сюды, сюды.

кіт.

猫咪，猫咪，
你们去过哪里？
去过奶奶家里。
你们做过什么？
我们磨过小麦，
现在面在哪里？
老鼠吃光了。
去哪儿拿？
来这里，来这里，来这里。

англ.

Kitty-cat, kitty-cat,
Patty-cake, patty-cake.
— Where did you go?
— To Granny's home.
— What did you do?
— Ground the grain.
— Where did you put it?
— Mice ate it again.
— Where did you bring it?
— Here, here, here.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

— Чыкі-чыкі, сарока,
А дзе была?
— Далёка.
А ў пана на таку
Я бачыла талаку:
Пані сына радзіла,
На коніка садзіла,
А конічак вараны,
А паночак малады.

кіт.

喜鹊喳喳叫，
你去哪里啊？
去远方。
我在打谷场上
看见一件事：
主妇生了儿子，
儿子已骑马，
马是黑黑的。
儿子小小的。

англ.

Tweet-tweet, magpie,
Where did you fly?
I flew away, far and wide,
Plenty of people there I spied:
The hostess has born a son,
A horse, they put him on,
The horse is black,
The boy sits astride its back.

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел. — *А курачка, рабашэчка!*
Пазыч жа мне грабушэчка!
Гута-та! Гута-та!
— Не пазычу, не прадам!
Прыйдзі ка мне — дарма дам!
Гута-та! Гута-та!

кіт. 我的鸡，有斑的鸡，
把面包借给我！
咯咯哒！咯咯哒！
我不借，也不卖！
送给你，到这里来！
咯咯哒！咯咯哒！

англ. — *Dum-dee-dum! Dum-dee-dum!*
Speckled hen,
Lend me a pen!
— I won't lend, I won't sell,
Just come here, get your pen!
Dum-dee-dum! Dum-dee-dum!

Мастак Ю. Мацура

бел. *Чукі-чукі-чучкі,*
На гары стручкі.
Курапатачкі
Іх клюваюць, і дзюўбаюць,
І Данілку забаўляюць.

кіт. 雏恰恰，雏恰恰，
山上有些豌豆荚
山鹑啄了，啄了豆，
达尼尔卡就快乐。

англ. *Chuki-chuki-chuchki*
Seed pods, in the hills.
Partridges,
Peck them, pill,
Amuse our Danil.

Мастак Г. Сідарэнка

бел.

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Куплю чаравічкі,
Малы, невялічкі,
На Валюшкіну ножку.
Кую, кую другую,
Паеду ў даўгую.
Дарожка даўгая,
А ножка — малая.

кіт.

钉了马掌，钉了马，
走的路肯定远。
小鞋子我要买，
瓦利沙穿肯定好。
钉了马掌，钉了马，
走的路肯定长，
路是长长的。
脚是小小的。

англ.

Shoe, shoe the hoof of my horse,
I shall go down to the fair.
Valya's feet are very small,
I'll buy her footwear there.
Shoe, shoe another hoof,
It's a long way to go.
The trip is long,
And small feet slow.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Сарока-варона на прыпечку сядзела,
Дзеткам кашку варыла,
Апалонікам мяшала,
А хвосцікам ківала,
Усім дзеткам давала:
Аднаму дала, другому дала.
— А ты, малы, круп не драў,
Вады не насіў, дзяжы не мясіў.
Схадзі, хлопчык, па вадзіцу,
Табе каша на паліцы,
На паліцы ў чарапіцы.
Тут пень, тут калода,
Тут мох, тут балота,
Тут крыніца і халодная вадзіца.
Шугі-шугі — паляцелі.

кіт.

乌鹊坐在炉子旁，
煮稀粥给孩子喝，
勺子搅饭，
尾巴摇摇，
稀粥分给孩子喝：
给一个，给两个，
宝宝，你可没帮忙，
米没剥，面没和，
宝宝，你快把水拿，
给你一点稀粥喝，
稀粥在瓦罐里，
瓦罐在架子上。
一个树墩在这儿，
一块木头也在这儿，
青苔、沼地都在这儿，
泉水、冷水都在这儿。
嗨，嗨，出去门去。

англ.

On the hearth the magpie sits,
Cooking porridge for the chicks,
With a ladle stirs the mix,
Swishing its black tail in flits.
Gives the porridge to the chicks:
Gives to one, then another,
But you, boy, grits did not bother,
Didn't bring water, nor knead the bread.
Go now, boy, bring some water instead,
Take the porridge when it's done.
On the shelf you'll still find some.
This is a stump, that is a log,
This is moss, that is a bog.
This is cold water, that is a frog.
Low, low, now off we go.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Сарока-варона
Кашку мяшала,
Сваім дзеткам давала.
— Ідзі, мышка, па ваду,
Табе кашкі пакладу.
Тут пень, тут калода,
Тут крыніца,
Тут халодная вадзіца.

кіт.

乌鹊搅拌粥，
喂给雏鸟喝。
老鼠，你拿水，
我把粥儿分你喝。
树墩在这儿，
木头也在这儿，
泉水、冷水都在这儿。

англ.

The magpie,
Cooked a pie,
Fed chicks with hungry eyes.
Go, little mouse, fetch water,
I'll give you pie if you're our porter.
This is a stump, that is a log,
Here at the source you won't find a bog.
This is cold water, that is a frog.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла?
— Лыжкі мыла.
— А што далі?
— Кусок сала.
— Дзе паклала?
— Пад лаўкаю.
— Чым накрыла?
— Халяўкаю.
— Дзе падзела?
— Кошка з'ела.

кіт.

老鼠，老鼠，你去过哪儿？
去过国王家。
做过什么呢？
洗了勺子。
给了什么呢？
一块脂油。
放在哪里啊？
放在凳子下。
什么上面盖？
靴子上面盖。
现在还有吗？
被猫吃光了。

англ.

— Mouse, mouse, where did you go?
— To the king's home.
— What did you do?
— Did washing up.
— What did they give to you?
— A piece of fat.
— Where did you put it?
— Under the bench.
— What did you cover it with?
— With a rag.
— Where is it now?
— Eaten by the cat.

Мастак Г. Сідарэнка

бел.

— Коця, коця, дзе была?
— У каморы.
— Што рабіла?
— Млечка піла.
— Што зрабіла?
— Збан пабіла.
— Апсік, апсік, апсік.

кіт.

猫咪，猫咪，你去过哪儿？
去过储物室。
在那儿做什么？
喝了牛奶。
还做了什么呢？
打破了陶罐。

англ.

— Kitty-cat, where did you go?
— To the buttery.
— What were you doing there?
— Drinking milk.
— What have you done?
— Have broken a jar.
— Shoo, shoo.



Мастак Х. Іванцова

бел. *Ішоў бай па сцяне,*
Нёс торбу на спіне.
Што ў торбе, то мне.
Што ў карыце, то Мікіце.

кіт. 睡梦背着包子
爬到一堵墙上。
包里东西给我，
盆里东西给尼基塔。

англ. *A dream's walking on the wall,*
Brings a bag into the hall.
I shall take the dream's large bag,
To Mikita give a tag.

Мастак В. Багнюк

бел.

— Коў-коў, кавалёк,
Падкуй чабаток.
— Я не ўмею каваць,
Мае ножкі баляць,
Мае ручкі звіняць.

кіт.

铁匠，铁匠，
钉个鞋子吧。
我不会钉鞋子，
我脚疼，
手动不了。

англ.

— Ting-tang, blacksmith,
Shoe the horse for me.
— No, no, I can't shoe,
My legs ache,
Arms ache too.

ПЕСНІ

歌曲

SONGS

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

Запражыце сівы коні
У паезд шырокі,
Ў ім паедзе верабейка
Да пані сарокі.
Як прыехаў верабейка,
Стукнуў чабатамі,
Выскачыла сарочанька
З нізкімі ўкланамі.
— Проша, проша, верабейка,
Мяне не цурацца,
І ва ўбогай маёй хатцы
Проша забаўляцца.
Прыйшоў мядзведзь дзіва глядзець
Ды стаў насміхацца,
А наш рыцар-верабейка
З ім за лоб цягацца.
Ды мядзведзю задаў дыхту,
Каб не забываўся,
Над рыцарам-верабейкам
Больш не насміхаўся.

кіт.

灰马套在大车上，
麻雀到喜鹊那儿去做客。
麻雀到，用靴子敲一敲，
喜鹊出来，向麻雀深深鞠一躬。
麻雀，请你进来，
在我贫穷简陋的房子里
痛快地玩吧。
一头熊来，开始嘲笑，
麻雀开始打架。
麻雀把熊打了一顿，
熊不再嘲笑麻雀了。

англ.

Harness the grey horses,
Into a wide cart,
The sparrow is going,
To visit the magpie.
Sparrow came hollering,
Clattering boots,
Magpie came out honouring,
Bowing low too.
— Dear sparrow, please, come in,
Into my poor house,
Feel at home within.
But the bear came in,
And started to mock,
Dear, sparrow, brave knight.
Started to fight.
The bear lost the bout,
Brave sparrow bawled him out,
Good and proper,
It was the last time the bear,
Was a scoffer.

Мастак А. Стальмашонак

бел. *Скача, скача верабей,*
Ён склікае ўсіх дзяцей,
Да дзяцей ён просьбу мае,
Ён цілікае, як знае:
— Скіньце, дзеткі, па зярну,
Я вам песеньку спяю.

кіт. 麻雀跳跳，
召唤孩子，
它请孩子做件事，
帮给我采一把米，
我把歌曲唱给你。

англ. *Little sparrow's skipping, skipping,*
Calling children to come and play,
Chirping as proudly as he can,
He just wants to asks for corn,
Children, please, bring some to me,
And I will sing a song for thee.

Мастак А. Кісляк

бел.

Сядзіць бусел на куце,
У тры лісты піша,
А журавель на прыпечку
Дзяціначку калыша.
А перапяліца
Хату падмятае,
Сарокі-прыданкі
Скачуць паверх лаўкі.
Сядзіць сава на куце
Скоса паглядае.

кіт.

鹳坐在角上，
写着一封信，
鹤在炉子旁
哄婴儿睡觉。
雌鹌鹑
打扫房间，
喜鹊
跳在长凳上。
猫头鹰从角上，
斜着看。

англ.

The stork's sitting in the corner,
Writes a letter, full of honour,
The crane's sitting on the hearth,
Lulling a baby through the night.
The quail's sweeping the floor,
The magpies are jumping,
By the door.
The owl's sitting in the corner,
All alert, eyes like a warner.

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел. *Белабока сарока*
Прыляцела здалёка,
Села ж яна на таку,
Ў яе хвосцік на баку.

кіт. 白喜鹊，
从远方飞来，
坐在打谷场，
尾巴长长的。

англ. *The white-sided magpie,*
Does not fly so high,
Sits down in its nest,
Black tail and white breast.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Кукарэку, петушок,*
Чырвоненькі грабяшок,
Пад паветачку пайшоў,
Курку рабую знайшоў.
Пачаў яе пытаці,
Ці ўмее чытаці.
— Не чытаю, не пішу,
Толькі яечкі нясу.

кіт. 公鸡，喔喔叫，
冠子红红的，
到棚子去，
碰到有麻斑的鸡，
问鸡会不会看书。
我不会看书，
也不会写字，
只会下蛋。

англ. *Rooster, cock-a-doodle-doo,*
Red cock's comb is a sight to view,
In the little penthouse, saw,
A spotted hen, he much adored.
He asked her:
— Can you read?
— Neither can I read, nor can I write,
I just lay eggs, I hope it's alright.

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел.

Сядзіць мядзведзь на калодзе,
Боты падшывае,
А заінька-работнічак
У скрыпачку йграе.
А варона, стара жона,
Яна прыпявае,
А сарока-белабока
Пайшла танцаваць.
А сініца-маладзіца
Пайшла ў поле жаць.
Ляціць сокал з красным вокам
Колас падбіраць.

кіт.

熊坐在木头上
缝靴子，
勤劳兔子
拉小提琴。
乌鸦伴唱，
喜鹊跳舞。
山雀去田地收获，
红眼的游隼
拾起一些麦穗。

англ.

The bear's sitting on a log,
Patching up his boots,
Hard-working rabbit's
Playing on his flute.
The old crow is singing,
Singing with a toot,
Young magpie's dancing,
Dancing for a hoot.
The little tit is hunting,
Hunting on the fruit.
Red-eyed falcon is
Collecting ears for loot.

Мастак Х. Іванцова

бел. *Іграў я на дудцы, ту-лю-лю!*
Седзячы у будцы, ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю!
Грае мая дудка: ту-лю-лю!
Пяе весялушка: ту-лю-лю!
Як іграла дудка: ту-лю-лю! —
Прыбег скакаць Юрка, ту-лю-лю!
А за Юркам — Янка, ту-лю-лю!
А за Янкам — Танька, ту-лю-лю!

кіт. 我吹了笛子，图-鲁-鲁！
坐在小棚里，图-鲁-鲁！
图-鲁，图-鲁，图-鲁-鲁，图-鲁-鲁！
我的笛子响，图-鲁-鲁，！
快乐地响着，图-鲁-鲁！
听到了笛子，图-鲁-鲁！
尤拉跑来了，图-鲁-鲁!
扬卡跟着尤拉，图-鲁-鲁！
塔尼亚跟着扬卡，图-鲁-鲁！

англ. *I shall blow my pipe, tu-lyu-lyu!*
Look, the corn is ripe, tu-lyu-lyu!
Tu-lyu, tu-lyu, tu-lyu-lyu, tu-lyu-lyu!
My pipe sounds good: tu-lyu-lyu!
As good as it should: tu-lyu-lyu!
Hearing the music: tu-lyu-lyu!
Yurka started dancing, tu-lyu-lyu!
Yanka after Yurka, tu-lyu-lyu!
Tan'ka after Yanka, tu-lyu-lyu!

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел.

Заінька да шарусенькі,
Заінька да бялюсенькі!
Праскачы, зайка, ў дзірачку
Да выламі сабе да быліначку.
Праскачы, зайка, куды хош,
Выбірай былінку, катору хош.
Заінька, павярніся,
Шэранькі, абярніся.
У нас гарадочкі гарадзецкія,
Усе ў нас зачэпачкі нямецкія,
А пайдзі, наш зайка, ў скокі, ў бокі,
Запляшчы, наш зайка, да ў далоні.

кіт.

灰色兔子，
白色兔子，
跳进洞里，
拔出草茎。
你随便跳，
把草茎挑，
兔子，转过来，
灰兔子，转一圈，
我们城市大大的，
我们铆钉德国的。
兔子，你跳舞吧，
兔子，你鼓掌吧。

англ.

Grey rabbit,
White rabbit!
Jump into the hole,
Pick a blade of grass.
Rabbit, you can jump high
Anywhere you wish,
Choose the grass you like,
Please, take any dish.
Rabbit, turn around,
Rabbit, do not frown.
Our towns are so grand,
Look around where you stand.
Dear rabbit, start the dance,
Dear rabbit, clap your hands.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Мы пасадзім грушку
Усе, усе,
Няхай наша грушка
Расце, расце.
Вырасці ты, грушка,
Вось такой вышыні,
Распусціся, грушка,
Вось такой шырыні!
Расці, расці, грушка,
Ды у добры час.

Патанцуй, Марылька,
Паскачы для нас.
А ўжо наша грушка
Распусцілася,
А наша Марылька
Зажурылася.
А мы тую грушку
Ўсе шчыпаць будзем,
Ад нашай Марылькі
Уцякаць будзем.

кіт.

我们要种一棵梨树，
让我们梨树
快长，快长。
我们梨树长得
真高，真高。
树枝长得
这么粗，这么粗。
我们梨树
好时光要快长，快长，
玛利亚，你跳舞，我们看。
我们梨树开花了，
我们玛利亚却发愁了。
我们要把梨摘光，
跑着离开玛利亚。

англ.

We shall plant a pear-tree,
All, all,
Let our pear-tree
Grow, grow.
Our tree, do grow high.
Our tree, do sprout wide!
Grow up, like a tower
In a good hour.
Dance, Maryl'ka,
Don't be full of gloom.
Our pear-tree
Is going to bloom.
But Maryl'ka is so sad.
Let's pick flowers, go ahead!
From Maryl'ka we all fled.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Пасу, пасу авечачкі
Недалёка ад рэчачкі.
Воўк за гарою,
А я за другою.
Ваўка не баюся,
Кіем баранюся.

кіт.

在岸上
我放羊。
在山后
有条狼。
为自卫
拿大棒。

англ.

Tending, tending sheep,
Right beside the stream.
A wolf is up the hill,
I am standing still.
If the wolf comes close,
Beat it on the nose.

ЗАКЛІЧКІ

号召歌

APPEALING RHYMES

Мастак Ю. Мацура

бел.

Святі, святі, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.
Пад хаткаю седзячы,
Лусту хлеба дзержачы.
Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.
Яечкі качаючы,
Песенькі спяваючы.
Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.

кіт.

太阳，发发光，
我们就暖和。
坐在房子前，
拿面包。
吃鸡蛋，
唱歌谣。

англ.

Lyuli, lyuli,
Lyuli, lyuli,
Sun, shine bright, bright,
We get warm, warm.
Lyuli, lyuli,
Lyuli, lyuli,
Sitting outside,
Eat a piece of bread.
Lyuli, lyuli,
Lyuli, lyuli,
Rolling eggs on the floor,
Singing songs by the door.
Lyuli, lyuli,
Lyuli, lyuli,

Мастак Ю. Мацура

бел. *Сонейка, сонца,*
Выгляні ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку.

кіт. 太阳，太阳，
你云间露出来，
你给我们发点光，
我们给你一点汤。

англ. *Sun, dear Sun,*
Look into the window,
If you shine a little please,
I will give to you these peas.

Мастак К. Вішнеўская

бел.

Ідзі, ідзі, дождыку,
Звару табе боршчыку.
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю.
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.

кіт.

下雨，下雨，
我给你煮红菜汤。
放在云杉下，
盘子盖上去。
自己尝一尝，
给你喝点汤。

англ.

The rain, fall, fall,
I will cook for you red-beet.
Put it under a fir-tree,
Cover it with a bowl.
Taste it for myself
And give to you as well.

Мастак А. Кісляк

бел.

Гары, гары ярка,
Прыедзе Захарка
У чырвонай шапцы,
Сам — на лашадцы,
Жана — на кароўцы,
Дзеці — на сабачках,
Казёл — у кафтане,
Каза — ў сарафане,
Вуткі — у будке.
Тараканы!
Біце ў барабаны!

кіт.

耀眼，太耀眼，
戴红帽的
扎哈尔来，
他骑马，
妻子骑牛，
孩子骑狗，
公山羊穿长袍，
母山羊穿长衫，
鸭子在小棚，
蟑螂敲着鼓！

англ.

Burn, burn bright,
Look, Zakharka comes at night,
Wearing a red hat,
Riding on a horse,
His wife's riding a cow,
His kids are riding dogs,
The goat wears a caftan,
Nanny- goat wears a sarafan,
Duck's wearing a tux,
Beetles!
Beating drum, calls!

Мастак Ю. Мацура

бел. *Божая кароўка,*
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода,
Пень ці калода?
Пагода — ляці,
Дождж — сядзі.

кіт. 天牛，天牛，
明天天气怎么样？
下雨还是晴天？
晴天就很好，
下雨就不要。

англ. *Ladybird, tell us,*
Will it rain tomorrow,
Will it be sunny?
If sunny, fly away,
If it rains, then stay.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Божая кароўка,*
Паляці на небка,
Прынясі нам хлебка,
Чорнага і белага,
Толькі не гарэлага.

кіт. 天牛啊，
飞到天上去吧，
给我们带吃的，
黑面包，白面包，
就是不要烤糊的。

англ. *Ladybird,*
Fly to the sky,
Bring us some bread,
Brown or white,
Just unburnt on your flight.

Мастак К. Гормаш

бел. *А сыраежкі — ўсё грыбы.*
А грыб-грыбавік,
Што пад дубам баравік,
Над грыбамі палкавік:
Заказаў усім грыбам
На вайну ісці.

кіт. 红菇也是蘑菇，
橡树下的牛肝菌
就是蘑菇的将军，
带着蘑菇去打战。

англ. *All the mushrooms had a talk,*
Their leader, Boletus,
who was under the oak,
To the mushrooms he spoke:
All of them should go to war,
He ordered them with great implore.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Коцік-абармоцік,*
Доўгія вусікі,
Тоўсценькія лапкі,
Ходзіць без шапкі.

кіт. 猫咪，猫咪，
须长长，
腿粗粗，
不戴帽。

англ. *Kitty cat, kitty cat,*
He wears no hat,
A round head, it is a fact
Long claws when he needs to act.



Мастак Х. Іванцова

бел. *Богаўка-сонейка,*
Паляці на воблачка,
Прынясі нам з неба
Мёду і хлеба.
Блінцоў-праснушак,
Салодкіх ватрушак.

кіт. 瓢虫，瓢虫，
到云上飞吧，
请给我们带来
蜂蜜和面包。

англ. *Dear ladybird,*
Fly up to the sky,
Bring for us, please,
Bread, honey, cheese,
Lenten pancakes,
And lots of sweets.

ЛІЧЫЛКІ

数数儿的儿歌

COUNTING-OUT RHYMES

Мастак Ю. Мацура

бел. *Раз, два, тры, чатыры,*
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

кіт. 一二三四五，
猫咪教数数，
不写字，不看书，
抓住许多小老鼠。

англ. *One, two, three, four,*
Cat is learning on the floor:
Not to read nor to write,
But to catch the mice, all right!

Мастак К. Гормаш

бел. *Раз, два, тры, чатыры, пяць,*
Выйшаў зайчык пагуляць.
А за зайцам — шэры воўк,
Воўк у зайцах знае толк.

кіт. 一二三四五，
兔子去散步。
狼在后面追，
肯定狼知道
兔子怎么捕。

англ. *One, two, three, four,*
Rabbit's going for a walk,
After rabbit, grey wolf goes,
What are rabbits, well he knows.

Мастак Ю. Мацура

бел. *Раз, два, тры, чатыры, пяць,*
Выйшаў месяц пагуляць,
А за месяцам луна.
Заставайся ты адна.

кіт. 一二三四五，
镰月去散步，
满月后边跟，
我说你就留在这儿。

англ. *One, two, three, four,*
The moon is going for a walk,
After it goes crescent moon,
But we'll see no moon at noon.



Мастак В. Багнюк

бел. *Ехаў мужык па дарозе,*
Зламаў кола на парозе.
Колькі патрэбна гваздзей,
Кажы хутчэй!

кіт. 一个人车上坐，
轮子坏了，
需要几个钉子，
请你快点说！

англ. *A man was carrying some hay,*
Broke a wheel on the way,
Does he need nails or not,
Quickly say what he's got!

Мастак В. Гормаш-Дрэбезава

бел.

Сава, соўка,
Маладая ўдоўка,
Сядзіць на павеці,
Люба паглядзеці:
Сама шэранькая,
Дзюбка доўгенькая.
Дзінь-бразь,
Выйдзі, князь,
Не забудзь дзіця.

кіт.

猫头鹰，猫头鹰，
年轻的凤凰雀，
坐在棚子上，
简直美极了：
身体灰色的，
鸟嘴长长的。
丁当一声响，
国王走出来，
别把孩子忘。

англ.

Owl, owl,
Pretty young fowl,
Sitting on the awning
Right when it is dawning:
The feather is grey,
The bib is long.
Ding, dong,
Go out, strong.

Мастак А. Кісляк

бел.

— Заяц-месяц,
І дзе быў?
— У лесе.
— Што рабіў?
— Лыкі драў.
— Куды клаў?
— Пад калоду.
— Выйдзі вон з карагоду!

кіт.

兔子-月亮，
去过哪里？
去过森林。
去做什么？
去割干草。
放在哪里？
木头下面。
从轮舞中出去吧！

англ.

— Rabbit-moon,
Where did you go?
— To the wood.
— What did you do?
— Tore off lime bast.
— Where did you put it?
— Under the snow.
— Out you go!

Мастак Г. Сідарэнка

бел.

Кацілася ягадка
Вакол гарода.
— Хто яе зловіць?
— Царскі сын.
Выйшаў, выйшаў,
Ён пайшоў,
На баярскі двор
Сышоў.

кіт.

一粒浆果
围着菜园转圈。
谁把浆果接住？
沙皇儿子接住。
沙皇儿子出了门，
到贵族院子去。

англ.

A berry is rolling
Around the yard.
— Who's going to catch it?
— The son of the Tzar.
He goes out the door
And quickly heads for
The big yard of Boyar.

Мастак Д. Петрусевіч-Кавальчук

бел. *Бег зай па бару,*
Абіраў лебяду.
Рваў, клаў у пучок,
Выбірайся, ваўчок.

кіт. 兔子松林跑，
找到了滨藜，
拔了，扎成捆，
大灰狼，快滚吧。

англ. *Rabbit's running in the wood,*
Picking saltbush where he stood
Gathered up into a bunch
You should not be late for lunch.

Мастак В. Багнюк

бел. *Кацілася торба*
З вялікага горба,
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

кіт. 一个袋子
从大驼背上滚下来，
袋里有小麦和面包。
你想与谁一起吃？

англ. *Sack's rolling*
From the back,
And inside is
Wheat and bread.
Who is hungry?
Go ahead.

Мастак А. Стальмашонак

бел.

Курыца-квактуха
Вадзіла дзяцей
Каля кляцей.
Квох — сесці
На красным месцы,
Яечка знесці.

кіт.

母鸡来到储藏室
领孩子们去散步。
咯咯地叫以后，
在好地方下个蛋。

англ.

Clucking hen
Took its chicks
To the barn.
Cluck — sits down
An egg she lays,
In a very good place.

Мастак А. Кісляк

бел.

Ішла кошка па раялі,
Наступіла на педалі
І запела:
«До, рэ, мі, фа, соль, ля, сі»,
Што ўкрала — прынясі.
— Я ўкрала каўбасу,
Заўтра рана прынясу.

кіт.

一只猫在钢琴上
踏上踏板，唱起来：
do、re、mi、fa、sol、la、si、
偷什么就来什么。
偷了香肠，
明天一早就拿来。

англ.

There was a cat on the piano,
Who stepped on a key,
And sang:
“do, re, mi, fa, sol, la, si”,
What you stole, quickly bring to me.
A sausage, I stole for a snack,
In the morning I’ll bring it back.

Мастак Г. Сідарэнка

бел.

Эна-бэна дудкі,
Гаспадар малюткі,
Гаспадыня яшчэ менша
І, напэўна, разумнейша.
Села баба на барону,
Паехала ў госці
І нарвала траўку,
Палажыла на лаўку.
Нехта траўку ўзяў,
Той прапаў.

кіт.

主人很小，
主妇更小，
而且可能更聪明。
村妇坐手车
去做客，
拔出草，
放在长凳上。
谁把草拿走了，
消失不见了。

англ.

Click-cluck-cluck,
Master's knee high to a duck,
His wife is even less,
And probably smarter, yes.
She sits on the barrow,
Went over to the marrows,
Picks up some herbs,
Puts them on the bench,
Whoever pinched the herbs,
Has never come back yet.

Мастак Ю. Мацура

бел.

Петушок, петушок,
Залаты грабяшок!
На саломцы спаў,
Ён рана ўстаў,
Па вадзічку пайшоў,
Маладзічку знайшоў.
Маладзічка дабра
Яму штонікі дала.
Ён і тыя не знасіў
І другія папрасіў.

кіт.

公鸡，公鸡，
金冠子！
禾秸上睡觉觉，
起得早，
水上走，
碰到一只小母鸡。
小母鸡很善良，
送它一条小裤子。
裤子公鸡没穿坏，
又来请求第二条。

англ.

Rooster, rooster,
Golden comb!
Slept on the straw,
Woke up at dawn,
Went to bring water,
Met someone's daughter,
The girl too kind, stopped to chat,
She gifted him a pair of slacks.
He did not wear out the pair,
Still, he asked for another
And thought it fair.



Мастак А. Кісляк

бел.

А шлі коні па вуліцы.
Чым яны папутаны?
Залатым путам
Пад капытам.
Зайка йдзе,
Траўку рве.
Што вырве,
То ў пучок.

кіт.

马儿街上跑。
什么被诱惑?
蹄下有金绳。
兔子跑,
去拔草,
拔出什么来,
拔出一捆草。

англ.

Horses go along the street.
What is under their feet?
Golden fetter
On their hooves.
Little rabbit
Slowly moves,
Picking grass along the path,
Makes a bunch, eats the lunch.

Мастак А. Стальмашонак

бел.

Ходзіць кошка
Ля акошка,
Маніць дзетак
Каля клетак:
— Ах вы, дзеткі,
Многа вас,
Красна шапка,
Прэч ад нас!

кіт.

一只猫
窗下跑，
鸟笼旁，
看见一群小孩子：
噢，你们都是小孩子，
你们中，
红帽子有许多，
离我们远一点！

англ.

By the window
The cat's walking,
To the children
It is talking:
— Children, listen,
What I say,
Who's got a red cap,
Go away!

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Для трэцяй кнігі намі былі абраны фальклорныя творы, якія складаліся для дзяцей і самімі дзецьмі. У калыханках, забаўлянках, песнях, заклічках, лічылках перад намі паўстае незвычайны, чароўны свет: тут размаўляюць жывёлы, яны дапамагаюць калыхаць дзіця, прыносяць яму сон, падарункі. Як і прыказкі, творы дзіцячага фальклору выконваюць выхаваўчую функцыю: гэта своеасаблівае праграмаванне дзіцяці на будучае жыццё, кароткае вершаванае апавяданне пра тое, як трэба весці гаспадарку, клапаціцца пра іншых.

Узнікае пытанне: ці патрэбныя сёння, у век інфармацыйных і нанатэхналогій, разнастайных гаджэтаў (у тым ліку і для дзяцей), традыцыйныя калыханкі і забаўлянкі? Мы лічым, што бясспрэчна неабходныя, бо назапашаныя за стагоддзі народная мудрасць, досвед назіранняў за паводзінамі дзіцяці, яго ўзроставымі асаблівасцямі супадаюць з сучаснымі высновамі такіх навук, як псіхалогія, псіхафізіялогія, анатомія і інш. Нават сёння ніякая дарагая радыёняня або дзіцячы ложак з аўтаматычным калыханнем і музычнымі цацкамімобілямі не заменіць матчынага цяпла і голасу. Па-ранейшаму лепшым спосабам закалыхаць дзіця з'яўляюцца манатонныя рухі і мелодыя. Менавіта яны садзейнічаюць наладжванню псіхаэмацыянальнага кантакту паміж маці і дзіцем, што не губляецца і праз гады. А недахоп такіх стасункаў у маленстве пазней прыводзіць да эмацыянальнай халоднасці і адчужанасці, прычыну якіх бацькі так і не могуць зразумець. Прапанаваныя ў кнізе тэксты калыханак дазволяць выкарыстоўваць слоўныя формулы на падсвядомым узроўні, будуць садзейнічаць развіццю маўлення і актывізацыі разумовай дзейнасці немаўляці. Разгляд жа яркіх самабытных малюнкаў дапаможа суаднясенню слоўнага і візуальнага вобразаў, а калі дзіцяці споўніцца адзін-тры гады, іх можна выкарыстоўваць для гульні-прыдумвання далейшай гісторыі персанажа.

На жыццяздольнасць і актуальнасць калыханак указвае і той факт, што да іх ніколі не знікала цікавасць паэтаў і мультыплікатараў: вершы-калыханкі Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Вольскага, М. Танка, Р. Барадуліна, Л. Дранько-Майсюка («Калыханка-лічылка»); маштабны расійскі праект «Колыбельные мира» (рэж. Е. Скварцова і інш., 2006–2012 гг., 60 серый). У аснову знакамітай

«Калыханкі» («Доўгі дзень...») на музыку В. Раінчыка, якая ўжо шмат гадоў гучыць у канцы аднайменнай дзіцячай перадачы, пакладзены верш Г. Бураўкіна. Цікава, што калыханкі ў аўтарскай інтэрпрэтацыі перасталі быць толькі творамі для дзяцей і прысвячаюцца бацькам, дарослым, гарадам, напрыклад: «Вушацкая калыханка (Рыгору Барадуліну)» Я. Янішчыц, «Калыханка маме» Н. Мацяш і інш. Дадзены феномен можна растлумачыць толькі сапраўднай магічнасцю жанру, яго яскравай апатрапейнай функцыяй: гэта своеасаблівая ахова ад жыццёвых турбот, вяртанне ў дзяцінства, свой родны куток, ва ўлонне роднай хаты, да роднай маці. Гэта выказванне шчырай любові да чалавека, малой і вялікай радзімы, праяўленне клопату пра іх.

Не менш важную функцыю выконваюць і забаўлянкі. Іх асноўная накіраванасць ужо адзначалася ва ўводзінах. Сувязь гэтых твораў з псіхафізіялагічным развіццём дзіцяці відавочная. Як заўважалася, пад рытмічныя словы асноўныя дзеянні выконваліся з пальчыкамі рук і ног дзіцяці. Псіхафізіёлагамі даказана, што менавіта ў падушачках пальцаў сканцэнтравана значная колькасць нервовых канчаткаў, што ўздзейнічаюць на розныя аддзелы галаўнога мозга. Тым самым нашы продкі, нават не ведаючы навуковых падрабязнасцей, прыкмячалі, што дзіця, з якім распрацоўвалі дробную маторыку, раней пачынала размаўляць і хадзіць, мела больш хуткую рэакцыю. Зарадкай з немаўлём неабходна займацца і ў наш час. Выкананне аднолькавых рухаў пад разнастайныя слоўныя прыгаворкі-забаўлянкі з'яўляецца цікавым, прыцягальным, вясёлым заняткам і для дзіцяці, і для яго бацькоў.

Цудоўны прыклад сувязі з асяроддзем, знітаванасці чалавека і прыроды, усведамлення таго, што ў наваколля ёсць свая душа, даюць заклічкі. Гэта своеасаблівы зварот да сонца, дажджу, божай кароўкі, грыбоў з надзеяй атрымаць добрае надвор'е і ўраджай. Жанр заклічкі ў яго дзіцячай інтэрпрэтацыі мае некаторыя аналогіі з «дарослым» таямнічым замоўным жанрам.

Каштоўнасць калыханак, забаўлянак і заклічак у першую чаргу заключаецца ў тым, што прадугледжвае цесную ўзаемасувязь дарослага і дзіцяці, дзякуючы якой ад старэйшага пакалення да малодшага перадаюцца веды, традыцыі,

погляды на жыццё, успрыманне прыроды, назапашаныя не толькі ў канкрэтнай сям'і, але і ў этнічнай культуры ўвогуле. І менавіта гэтая сувязь пакаленняў застаецца неабходнай і запатрабаванай ва ўсе часы — эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, касмічную эру, час панавання нанатэхналогій. Душа чалавека заўсёды будзе хінуцца да сваіх бацькоў і таго куточка, дзе ён нарадзіўся, бо менавіта з гэтымі рэаліямі ўстойліва звязана пачуццё ўтульнасці, псіхалагічнага камфорту і абароненасці, якое не заменяць ніякія навамодныя прылады.

Некалькі іншую накіраванасць маюць фальклорныя тэксты, створаныя самімі дзецьмі, паколькі яны датычацца сферы міжасабовых стасункаў у пэўнай узроставай групе. У дадзенай кнізе ў якасці найбольш выразнага прыкладу абраны лічылкі. З дапамогай гэтага невялікага верша вырашаліся многія спрэчкі ў дзіцячым калектыве падчас гульні і ў пэўных канфліктных сітуацыях. Аднак узнікненне дадзенага жанру мае не толькі прагматычную накіраванасць. Яшчэ раз падкрэслім, што лічылкі ствараліся менавіта дзецьмі, а гэта значыць, што такія творы садзейнічалі развіццю творчага мыслення, фантазіі, давалі магчымасць упершыню ўвайсці ў свет паэзіі, пачаць рыфмаваць словы. Сучасныя дзеці таксама не губляюць дадзеных навыкаў: ім па-ранейшаму цікава ствараць уласныя невялікія вершы, адгукаючыся такім чынам на навакольныя рэаліі. Доказам неперарыўнасці традыцыі можа выступаць і той факт, што адзін з аўтараў кнігі, працуючы ў канцы 1990-х гадоў у дзіцячым летнім лагеры, пачуў лічылку на матыў «На златом крыльце сидели…», дзеючымі асобамі якой былі больш актуальныя для тагачасных дзяцей персанажы з папулярнага ў той перыяд серыяла «Санта-Барбара».

Спадзяёмся, што наша кніга будзе цікавая як дарослым, так і дзецям. Першыя змогуць выкарыстоўваць самабытныя, яскравыя, нацыянальна адметныя паэтычныя ўзоры фальклору пры выхаванні дзяцей, а тыя, у сваю чаргу, зацікавяцца прафесійна выкананымі малюнкамі і з іх дапамогай змогуць фантазіраваць і ўяўляць далейшае жыццё і прыгоды персанажаў. Выпрацаваныя дзякуючы жыццёваму вопыту нашых продкаў формы выхавання, развіцця, сацыялізацыі дзяцей розных узростаў з'яўляюцца ўнікальнай крыніцай для іх трансляцыі сродкамі сучасных тэхналогій пры стварэнні інтэрактыўных 3D-інсталяцый. Адным з падобных паспяховых міжнародных праектаў выступае «Future Live», экспазіцыя якога ў Мінску паказала, што фармат інтэрактыўных

выстаў абсалютна актуальны і магчымы для развіцця сучаснай культуры і выхавання дзяцей. Выкарыстанне ж аўтэнтычных тэкстаў і вобразаў з беларускага фальклору дапаможа надаць падобнай экспазіцыі нацыянальны каларыт.

У прапанаваным выданні творы перакладаюцца на кітайскую і англійскую мовы, што дае магчымасць іншым народам на шырокай еўраазіяцкай прасторы пазнаёміцца з яшчэ адной старонкай непаўторнай беларускай культуры, яе вобразамі і паэтыкай.

后序

为了组成这一系列的第三本书，我们挑选了为孩子创作的和孩子自己创作的作品。像谜语一样，摇篮曲、游戏话、数数儿的儿歌、号召歌也都表现神秘的世界：动物会说话，帮助摇晃孩子的摇篮，给孩子带来睡梦和礼物。和谚语一样，儿童创作有培养孩子的功能，形成孩子将来生活、治家、照顾别人的准则。

但是有一个问题：现代是信息技术、纳米技术、先进电子设备（包括儿童使用的机械）的时代，我们需不需要传统摇篮曲和游戏话？我们认为，肯定需要。主要原因是祖先由孩子的活动、岁数特点得出的结论与现代科学（心理学、生理学、解剖学等）的研究结果是不谋而合的。连最贵的婴儿监控器或者具有音乐玩具的自动摇动的摇篮也不能代替母亲的声音和温情。简单的动作和音调仍然是安慰孩子、维持母亲和孩子的内心联系最好的方式。这种联系即使过了几十年还是会有影响的。缺乏这种联系的结果是孩子的冷淡态度和疏远，而父母还不明白这种态度的原因。这本书中的摇篮曲为父母提供的文词格式，婴儿在潜意识中会记住的，促进说话能力，开发智力发展。孩子看了独特和鲜艳的画儿就可以对比文词和目视意象。孩子满了二三岁，就可以用画儿来想出关于摇篮曲的主角的各种故事。

诗人和动画片工作人员之所以对摇篮曲一直感兴趣，是因为摇篮曲具有很大的现实性和生命力。摇篮曲的作者包括许多杰出的人：弗朗西沙•克伯咕什维奇、扬卡•卢奇那、阿尔图•沃尔西、马克西姆•坦克、格里戈里•波罗独令、列奥尼德•德兰阔-麦需克（“摇篮曲——数数儿的儿歌”）；不久前俄罗斯有一个大型节目《世界上的摇篮曲》（导演是伊丽莎白•斯克瓦尔措瓦，2006-2012年，60集）。多年来我们在儿童电视节目《摇篮曲》中可以听到一首著名的“摇篮曲”（诗人是根纳季•布拉夫京，音乐家是瓦西里•拉英奇克）。值得注意的是，有的作者把摇篮曲献给父母、其他成年人、故乡的城市，比如：叶夫根尼娅•娅尼西慈的“吴啥奇摇篮曲”（献给格里戈里•波罗独令）、妮娜•玛洽西的“献给母亲的摇篮曲”等。真正的魅力和强大的保护力是解释这个现象的原因：摇篮曲是一种防止生活危险，回归到童年、故乡、母亲的方式。摇篮曲是对人、故乡真挚情感和关心的表现方法。

游戏话是同样重要的。游戏话的本质我们在前言已经提到了。这些作品和孩子的心理、生理发展的关系是明显的。像我们所说的，有节奏的游戏话与手指、脚趾的动作相配合。心理生理学家证明了指腹和趾腹

有许多影响脑子各种部分的神经末梢。那么，祖先虽然没有进行过科学调查而知道了做精细动作的孩子比其他孩子早学会走路，有快速反应的事实。现在我们知道了与婴儿做操的必要性。对婴儿和父母来讲，一边说游戏话一边做操是多么有意思、多么有趣啊！

号召歌证明人与自然的联系。人意识到自然万物都有灵性。号召歌中有对太阳、雨水、瓢虫、蘑菇的招呼来祈求好天气、好收获。儿童号召歌与“成年人”神秘的咒语有一定关系。

摇篮曲、游戏话、号召歌的重要性首先是维持成年人和孩子的密切联系。因为有这种联系长辈就可以把几代人积累的知识、习俗、对生活和自然的观察结果传给晚辈。无论是哪个时代，农业时代、科技革命时代还是太空和纳米技术时代，这种亲属、代际联系都是最重要的。人的心灵永远牵系着父母和家乡，因为这与安全感和舒适感这两个因素有密切关系，是先进机械所不能代替的。

儿童自己创作的作品不一样，因为这涉及到儿童圈内关系。本书包含的数数儿的儿歌就表现了这个情况。不仅玩游戏时，而且在别的纠纷情况下，短数数儿的儿歌是解决争端的简单方式。数数儿的儿歌的出现不只是有使用的目标。数数儿的儿歌因为是儿童自己创作的，所以促进儿童的创造思想的发展，儿童可以进入诗歌的世界、自己做诗。儿童对这样活动还是很感兴趣的：创作小诗对他们也很有意思。这些小诗是结合周围环境的现象的结果。比如，本书的作者1990年代在少年夏令营工作时，听到“在金的台阶上坐的是……”那个数数儿的儿歌包含了当时很流行的“桑塔巴巴拉”电视连续剧主角名字的数数儿的儿歌。

我们希望成年人和孩子都会喜欢这本书。成年人在培养孩子时可以利用民间创作的独特、杰出、民间文化特色的作品。孩子会喜欢职业画家画的画儿，看画儿就可以想出关于主角的各种故事来。民间创作展现的祖先对培养不同岁数的孩子的生活经验，可以使用3D互动的技术来表现。2018年夏天于明斯克举行的«Future live»博览会是这类国际项目之一。使用白俄罗斯民间创作的意象和正式文本更加具有民族特色。

像以前出版的两本书一样，这本书也有中文和英文的翻译。这为住在欧亚地区的不同人民提供了认识独特而丰富的白俄罗斯文化的新机会。

CONCLUSION

The third book was composed of the folklore works selected by children themselves. In the same way as in riddles, the wonder of the world appears in lullabies, counting-out, amusing and appealing rhymes: animals can speak in them, they help to cradle a baby, usher the baby's sleep and bring gifts. Similar to proverbs, folklore for children contains an educating component, short rhymed narrations about how to run the house, care for others, etc., prepared the child for future life.

One may wonder if there is any necessity in lullabies and amusing rhymes in the present time of cutting-edge gadgets (even for children), information and nanotechnologies. Yet, we do think they are absolutely essential. The folk wisdom collected and stored by centuries, our forefathers' wit and observations of the child's behaviour and peculiarities of each age period coincide with contemporary conclusions from psychology, psychophysiology, anatomy, etc. Even today no auto-swing cradle with musical toys or baby monitor can be used in exchange for the mother's affection or her voice. Still, as it was long ago, monotonous swinging and a melody is the best way to lull to sleep a child. Moreover, this is a way of psychological and emotional bonding between mother and baby, which remains for years. The lack of such a kind of relationship in childhood leads to the emotional coldness and aloofness, which parents are not able to find a reason for in the future. The lullabies suggested in the book would be of help to the parents in order to use the verbal formulae that remain on the subconscious level and assist to the mental and speech development of the baby. When looking at vibrant, original pictures a verbal image could be associated with a visual one; for a child from one to three years old the book might be used for a following game: to think up the continuation of a character's story.

Lullabies' long life and relevancy is proved as well by the fact that they have always been a subject of interest for poets and cartoonists: like lullabies in verse by F. Bahushevich, Ya. Luchyna, A. Volski, M. Tank, R. Baradulin, L. Dranko-Maisyuk ("Counting-out Lullaby") and a major Russian project "The World Lullabies"

(dir. Ye. Skvartsova, etc., 2006-2012, 60 episodes). The most popular work is "The Lullaby" ("A long day..."), its poem is written by H. Buraukin and music by V. Rainchyk, "the Lullaby" has for many years been heard on TV at the end of the same-named child programme. It is worth mentioning that lullabies written by a definite author are not necessarily directed only towards children, they may be devoted to parents, adults, towns, for instance, the lullaby "Ushachy lullaby (to Ryhor Baradulin)" Ya. Yanishchyts, "The lullaby for mother" N. Matsyash, etc. That phenomenon can only be explained by some magic of the genre, an apotropaic function: a sort of protection from daily troubles, returning to a childhood, to an own and cosy place in the home, to mother. This is expressing sheer love and care for the human, birthplace and native land.

The amusing rhymes are of great importance as well. The amusing rhymes' main purpose has already been described at the introduction. Connection of these folklore works to the child psychophysiological development is quite evident. As it has already been mentioned, when reciting the rhymes an adult plays with a child's hands and feet. Psychophysiologists proved that it is at the finger pads where the majority of nerve-endings effecting different brain subdivisions are located. Thereby our ancestors without having any scientific data noticed that a child, with whom the fine motor skills were trained, started to speak and to walk sooner and had quicker reflexes. Exercises for the baby are necessary nowadays as well; moreover, how interesting, amusing and catching they could be for both the baby and the parent if monotonous movements are accompanied by various amusing rhymes!

Appealing rhymes could serve as a wonderful example of connection to the world around, close interrelationships between humans and nature, as well as realizing that everything around has its own soul. These rhymes are addressing the sun, the rain, a ladybird, mushrooms with a hope to get good weather and rich harvest. The genre of appealing rhymes is somehow reminiscent of an "adult" mysterious "spellcasty" genre.

The lullabies' main value is in the first place ability to establish a close connection between the child and the adult, it is exactly thanks to this connection that the knowledge, traditions and views on nature and life collected not only

by the family unit but by the generations of the ethnic culture on the whole are transmitted to the younger generations. That very connection between generations stays essential and actual regardless of time, whether it is the agricultural period, the technological revolution or the space age and the nanotechnology stage. The human soul will always strive after the parents and the corner where he/she was born as it is these facts of life that give the feeling of comfort and safety that no modern gadget can exchange.

The folklore created by children themselves has its own peculiarities as it reflects special relations of the defined age group. The counting-out rhymes in the book may serve as the most vivid examples. A short rhyme was able to settle many disputes in a children's group, not only when playing but at other questionable matters as well. Yet appearance of that genre doesn't limit itself to just a pragmatic purpose. One should stress out once again that countingout rhymes had been created by children themselves which stimulated fantasy, creative thinking development and gave a chance to start rhyming and step into the world of poetry for the first time. Present-day children maintain the acquired skills as well: they are still fond of making-up small verses, reflecting on the phenomena of the contemporary life. One good piece of evidence of the traditional integrity may be the following example: when working at a summer camp for children at the end of the 1990s one of the book's authors heard a popular counting-out rhyme "On the golden porch were sitting...", but instead of the regular characters children enumerated characters from "Santa Barbara", a popular series of that time.

Thus, we hope that our book will be of some interest for both children and adults. Adults could use vivid, original national folklore examples for the upbringing of children. In their turn, children would be glad to watch colourful professional paintings and make up the characters' future stories and adventures. The socializing, educating and upbringing materials for children of different age groups developed by our forefathers is a unique source, in which to build upon the base and create 3D interactive installations using contemporary technologies. "Future life" is one of such successful international projects. The project exhibition that took place in Minsk, in the summer of 2018 showed that

such a combination is absolutely relevant and appropriate for the contemporary culture development and children upbringing. Moreover, the use of the Belarusian folklore original texts and images does help to enrich such exhibitions with ethnic flavour.

As in the previous two books the works of the present edition have been translated into Chinese and English languages. Such an approach gives a possibility to the representatives from other cultures to get acquainted with one more side of the unique Belarusian culture, its images and poetics.

СПІС МАСТАКОЎ І ІХ РАБОТ

画家名录及作品

LIST OF PAINTERS AND WORKS

Багнюк Валерыя Аляксандраўна

«Баю-баю-бай…». 2018 г. Лічбая графіка. 19 × 19 см.
«Ладу-ладу-ладкі…». 2018 г. Лічбавая графіка. 19 × 19 см.
«Кацюты, кацюты…». 2018 г. Лічбавая графіка. 19 × 19 см.
«Коў-коў, кавалёк…». 2018 г. Лічбавая графіка. 19 × 19 см.
«Кацілася торба…». 2018 г. Лічбавая графіка. 19 × 19 см.
«Ехаў мужык па дарозе…». 2018 г. Лічбавая графіка. 19 × 19 см.



Вішнеўская Кацярына Андрэеўна

«Ля коціка варката…». 2018 г. Акварэль. 29 × 42 см.
«Пайшоў каток пад масток…». 2018 г. Акварэль. 25 × 29 см.
«Люлі-люлі-люлі…». 2018 г. Акварэль. 21 × 29 см.
«Баю-баю-баінькі…». 2018 г. Акварэль. 29 × 42 см.
«Баю-баю-баю…». 2018 г. Акварэль. 29 × 21 см.
«Ідзі, ідзі, дожджыку…». 2018 г. Акварэль. 29 × 21 см.



Гормаш Кірыл Уладзіміравіч

«А сыраежкі – ўсё грыбы…». 2018 г. Акварэль. 14 × 14 см.
«Раз, два, тры, чатыры, пяць…». 2018 г. Акварэль. 15 × 15 см.

Гормаш-Дрэбезава Валерыя Паўлаўна

«Хадзіў каток па капусце…». 2018 г. Лічбавая графіка. 17 × 16 см.
«А-а-а, люлі-люлінькі…». 2018 г. Лічбавая графіка. 31 × 19 см.
«Сядзіць мядзведзь на калодзе…». 2018 г. Акварэль. 20 × 20 см.
«Белабока сарока…». 2018 г. Акварэль. 17 × 16 см.
«Сава, соўка…». 2018 г. Акварэль. 20 × 20 см.
«А курачка, рабашэчка!». 2018 г. Лічбавая графіка. 16 × 15 см.

Іванцова Хрысціна Сяргееўна

«Ішоў бай па сцяне…». 2018 г. Туш, пяро. 15 × 15 см.
«Іграў я на дудцы, ту-лю-лю!». 2018 г. Туш, пяро. 14 × 12 см.
«Богаўка-сонейка…». 2018 г. Туш, пяро. 13 × 13 см.
«Люляй-люляй-люляшынькі…». 2018 г. Аловак. 21 × 21 см.

Кісляк Аліна Аляксандраўна

«Люляю-люляю…». 2018 г. Акварэль, акрыл. 30 × 25 см.
«Люлі-люлі-люлі…». 2018 г. Акварэль. 21 × 16 см.
«Люлі-люлі, каточак…». 2018 г. Лічбавая графіка. 21 × 18 см.
«Сядзіць бусел на куце…». 2018 г. Акварэль. 20 × 24 см.
«Ішла кошка па раялі…». 2018 г. Акрыл, аловак. 20 × 20 см.
«А шлі коні па вуліцы…». 2018 г. Лічбавая графіка. 34 × 33 см.
«Гары, гары ярка…». Лічбавая графіка. 2018 г. 20 × 17 см.
«Заяц-месяц…». 2018 г. Акварэль. Лічбавая графіка. 40 × 27 см.

Мацура Юлія Уладзіміраўна

«Баю-баю-баенькі…». 2018 г. Акрыл, аловак. 20 × 22 см.
«Люлі-люлі, цэлы дом спіць…». 2018 г. Акрыл, аловак. 20 × 28 см.
«Коцік-абармоцік…». 2018 г. Акварэль. 21 × 29 см.
«Баю-баю-баінькі…». 2017 г. Акварэль. 20 × 24 см.
«Люлі-люлі-люлі…». 2018 г. Акварэль. 27 × 20 см.
«Чукі-чукі-чучкі…». 2018 г. Акварэль. 16 × 26 см.
«Сарока-варона на прыпечку сядзела…». 2018 г. Акрыл, аловак. 20 × 29 см.
«Сарока-варона…». 2018 г. Акрыл, аловак. 21 × 28 см.
«Кукарэку, петушок…». 2018 г. Акварэль. 20 × 27 см. «
«Раз, два, тры, чатыры…». 2018 г. Акрыл, аловак. 29 × 20 см.
«Мы пасадзім грушку…». 2018 г. Акрыл, аловак. 20 × 29 см.
«Пасу, пасу авечачкі…». 2018 г. Акварэль. 27 × 20 см.
«Святі, святі, сонейка…». 2018 г. Акварэль. 19 × 28 см.
«Сонейка, сонца…». 2018 г. Акрыл, аловак. 29 × 20 см.
«Божая кароўка…». 2018 г. Акварэль. 30 × 18 см.
«Божая кароўка…». 2018 г. Акварэль. 20 × 29 см.
«Раз, два, тры, чатыры, пяць…». 2018 г. Акрыл, аловак. 29 × 20 см.
«Петушок, петушок… 2018 г. Акварэль. 20 × 30 см.

Петрусевіч-Кавальчук Дар'я Юр'еўна

«Ой ты, коце шэры…». 1018 г. Аловак. 12 × 12 см.
«Пайшоў каток у лясок…». 2018 г. Аловак. 15 × 15 см.
«Люлі-люлі-люленькі!». 2018 г. Аловак. 15 × 21 см.
«— Чыкі-чыкі, сарока…». 2018 г. Аловак. 15 × 21 см.
«— Мышка, мышка, дзе была?». 2018 г. Аловак. 10 × 12 см.
«Запражыце сівы коні…». 2018 г. Аловак. 15 × 20 см.
«Заінька да шарусенькі…». 2018 г. Аловак. 17 × 17 см.
«Бег зай па бару…». 2018 г. Аловак. 10 × 15 см.

Сідарэнка Глеб Ігаравіч

«Эна-бэна дудкі…». 2018 г. Афорт. 15 х 15 см.
«Кую, кую ножку…». 2018 г. Афорт. 10 х 15 см.
«Коця, коця, дзе была?». 2018 г. Афорт. 15 х 15 см.
«Кацілася ягадка…». 2018 г. Афорт. 10 х 10 см.

Стальмашонак Анастасія Алегаўна

«А… а… , люлі, а… а… , люлі». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.
«А-а, люлі-люлі, прыляцелі гулі…». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.
«Хадзі, сонейка, да нас…». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.
«Скача, скача верабей…». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.
«Ходзіць кошка…». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.
«Курыца-квактуха…». 2018 г. Акварэль. 26 × 18 см.

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ 5

前言 12

INTRODUCTION 17

КАЛЫХАНКІ 24
摇篮曲
LULLABIES

ЗАБАЎЛЯНКІ 70
游戏话
FUNNY RHYMES

ПЕСНІ 96
歌曲
SONGS

ЗАКЛІЧКІ 118
号召歌
APPEALING RHYMES

ЛІЧЫЛКІ 138
数数儿的儿歌
COUNTING-OUT RHYMES

ЗАКЛЮЧЭННЕ 170

后序 174

CONCLUSION 176

СПІС МАСТАКОЎ І ІХ РАБОТ 180
画家名录及作品
LIST OF PAINTERS AND WORKS

Літаратурна-мастацкае выданне

«ХАДЗІ, СОНЕЙКА, ДА НАС...»

(з народнапаэтычнай спадчыны)

“太阳，到这里来……”

（来源于民间文化遗产）

“DEAR SUN, PLEASE, COME TO US...”

(folk heritage collection)

Укладальнікі:

Лакотка Аляксандр Іванавіч,
Кухаронак Таццяна Іванаўна,
Алфёрава Алена Генадзьеўна

На беларускай, кітайскай і англійскай мовах

Пераклад на кітайскую мову *А. В. Раманоўскай, Ван Цінфэна*
Пераклад на англійскую мову
А. В. Раманоўскай, Ю. М. Шукала, Л. Болтана-Сміта

Рэдактар *В. А. Рахуба*
Мастацкі рэдактар і камп'ютарная вёрстка *У. П. Свентахоўскага*

0+

Падпісана да друку 05.08.2019. Фармат 70×90 1/16.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум.-друк. арк. 13,42.
Ул.-выд. арк. 12,7. Тыраж 700 экз. Заказ № 1981.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.

ISBN 978-985-08-2465-3

«ХАДЗІ, СОНЕЙКА, ДА НАС...»